Падпіска-2007

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ

Ідзе падпіска на 3-і квартал і II паўгоддзе 2007 года.
ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»
(У РУБЛЯХ, УСТАНОЎЛЕНЫ З 01.07.2007 Г.)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**8200**	**24600**	**49200**
63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**7850**	**23550**	**47100**
63858 (ведамасны)	**13000**	**39000**	**78000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**11850**	**35550**	**71100**

СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ, паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

29 МАЯ 2007 г.
АЎТОРАК

№ 97 (25962)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Леанід КОЗІК:

«БЫЛО Б ГЛУПСТВАМ СТРАЧВАЦЬ ГРОШЫ З-ЗА НАДУМАНЫХ МАТЫВАЎ»

Еўрапейская камісія па ініцыятыве Міжнароднай канфедэрацыі прафсаюзаў мае намер пазбавіць нашу краіну прэферэнцый на гандаль беларускімі таварамі ў Еўропе. У выпадку адмены льготных экспартных умоў эканоміка нашай краіны ў год будзе страчваць каля 400 мільёнаў еўра. Прычым гэта будуць сродкі прадпрыемстваў, таму што яны вядуць прамы гандаль з замежнымі краінамі, і менавіта ім вяртаюцца прыбыткі ад экспарту выраблены тавараў.

У размове з карэспандэнтам «Звязды» старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід Козік падкрэсліў, што фактычна больш за ўсіх пацерпяць працоўныя, таму што гэтыя зароблены работадаўцам матэрыяльныя сродкі вярталіся ў выглядзе заработнай платы, стварэння новых рабочых месцаў, выплатаў па калектыўных дагаворах.

— Можна растлумачыць сітуацыю проста. Уявіце, што беларускае прадпрыемства экспартуе тавар у Еўропу, па ўмоўнаму кошту за адну адзінку ў 1000 рублёў. Пры гэтым, як прадстаўніку краіны з пераходнай эканомікай, яму паніжаюць мытную пошліну на ўвоз або ўвогуле могуць яе адмяніць. Гэта і ёсць гандлёвая прэферэнцыя краінам, якія сталі на шлях развіцця. У выпадку пазбаўлення Беларусі льготных умоў на экспарт мы будзем вымушаны прадаваць тавар ужо за 1500 рублёў, пры тым што канкурэнты з замежных дзяржаў будуць і па-ранейшаму экспартаваць сваю прадукцыю па таму ж кошту ў адну тысячу, — тлумачыць Леанід Козік. — Як толькі мы даведаліся аб магчымай адмене прэферэнцый, то пачалі актыўна дзейнічаць. Я вырашыў, што трэба зрабіць усё, каб сітуацыя не развівалася ў адмоўным для беларускіх працоўных накірунку. Меры па пазбаўленню прэферэнцый могуць уступіць у сілу ўжо летам гэтага года. Аднак канчатковага рашэння яшчэ няма.

Па ўласнай ініцыятыве Леаніда Козіка Федэрацыя прафсаюзаў распрацавала і рэалізавала шэраг мераў. Яна звярнулася да ўсіх прафсаюзных цэнтраў свету, у пасольствы еўрапейскіх дзяржаў у Беларусі і Расіі, якія працуюць з нашай краінай. Усе прафсаюзы краіны, якія ўваходзяць у Федэрацыю, падтрымалі і падпісалі пісьмы і звароты да замежных дзяржаў. У выніку былі накіраваны тысячы пісьмаў, тэлеграм, зваротаў, пасланняў па электроннай пошце. ?Пісьмы ў пасольствы прыходзілі мяхамі, паштальёны не паспявалі падвозіць іх, а прадстаўнікі пасольстваў распісвацца аб атрыманні. За ўвесь час падрыхтоўчай работы мы накіравалі каля 100 000 пісьмаў! — кажа Леанід Козік. — Аднак на гэтым наша дзейнасць не скончылася. Мы звязаліся і з кіраўнікамі беларускіх прафсаюзных арганізацый, якія не ўваходзяць у Федэрацыю. Аднак ніводны з іх не падпісаў наш зварот да прадстаўнікоў замежных прафсаюзаў і дзяржаў. Я не саступіў і наладзіў сувязь з кіраўнікамі прафсаюзных аб'яднанняў, якія не ўваходзяць у беларускую федэрацыю, непасрэдна на прадпрыемствах. І вось ужо там, у пярвічных арганізацыях, мы знайшлі паразуменне».

У выніку Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі заручылася дапамогай дзесяткаў замежных краін. І гэта можа прынесці свае станоўчыя вынікі. Справа ў тым, што сёння ў Жэневе пачынае работу сесія Міжнароднай арганізацыі працы, на якой і будзе пастаўлена кропка ў пытанні прэферэнцый для нашай краіны.

— На сесію Міжнароднай арганізацыі працы прыязджаюць усе дзяржавы свету. З кожнай краіны накіроўваюцца прадстаўнікі ўрада, наймальнікаў і прафсаюзаў. Апошнія фарміруюць так званую «Групу працоўных». Мы звярнуліся да дэлегатаў ад прафсаюзных арганізацый свету з прапановай захаваць прэферэнцыі для нашай краіны, або адцягнуць іх адмену. Усе беларускія працоўныя падтрымліваюць нашы ініцыятывы. Дзякуючы нашым зваротам і пісьмам, у час работы сесіі, калі будзе прымацца канчатковае рашэнне, нам абяцаюць дапамагчы дзесяткі прафсаюзных арганізацый з замежных краін, акрамя таго, свае подпісы пад нашым зваротам іншыя ўдзельнікі сесіі паставяць непасрэдна ў Жэневе, — кажа Леанід Козік. — Таму будзем змагацца да апошняга. Было б глупствам страчваць з-за надуманых матываў вялікія матэрыяльныя сродкі.

Аляксандр ВАЛЯНЦІНАЎ.

ПРЭЗІДЭНТ ПАВІНШАВАЎ

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева з нацыянальным святам — Днём Рэспублікі.

«Перакананы, што высокі ўзровень палітычнага дыялога, сумесныя намаганні Беларусі і Азербайджана ў справе паступальнага развіцця ўзаемавыгаднага двухбаковага супрацоўніцтва поўнасцю адпавядаюць інтарэсам нашых народаў», — адзначыў у віншаванні Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Парламенцкі дзёнік

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ ПРАГАЛАСАВАЎ ЗА АДМЕНУ ЛЬГОТ

На ўчарашнім пасяджэнні сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу члены верхняй палаты беларускага парламента адобрылі праект Закона «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян». За адабрэнне дакумента выказаліся ўсе парламентарыі, якія прынялі ўдзел у галасаванні (47 чалавек).

На мінулым тыдні законапраект быў адобраны ў двух чытаннях Палатай прадстаўнікоў. Дакумент прадугледжвае адмену льгот для шэрагу груп насельніцтва. Прадстаўнікі выканаўчай улады адзначаюць, што эканомленыя сродкі будуць накіраваны на адрасную сацыяльную абарону насельніцтва, дзяржаўныя праграмы ў сферы медыцыны і дзяцінства, праграмы па пераадоленню наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Як адзначыў учора на пасяджэнні верхняй палаты парламента старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Анатоль Новікаў, у выпадку падпісання законапраекта Прэзідэнтам Беларусі, дакумент уступіць у дзеянне з 1 студзеня 2008 года.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

ISSN 1990-763X

9 771990 763008

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА

Уцёкі ад спёкі

Турысты з Мінска адпачываюць на вадаспадзе лясной рэчачкі ў Мядзельскім раёне.

СПЯКОТНЫ ТЫДЗЕНЬ НА ФОНЕ НАВАЛЬНІЧНЫХ ДАЖДЖОЎ

У бліжэйшыя трое сутак, да 31 мая ўключна, у нашай краіне захаваецца спякотнае, але няўстойлівае надвор'е, калі кароткачасовыя дажджы будуць назірацца нават з сур'ёзнымі навальніцамі, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.

Тэмпература паветра ў гэтыя дні на большай частцы тэрыторыі Беларусі будзе дасягаць удзень 27—33 градусаў, толькі 30 і 31 мая ў заходняй частцы краіны стане свяжэй — да 22—26 градусаў. Даволі спякотна будзе і ў першыя дні чэрвеня: тэмпература паветра ўдзень — 24—29 градусаў, а па ўсходу краіны нават да 30 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, гарачыня спадзе толькі ў нядзелю, калі чакаецца 19—24 градусы, аднак у паўднёвых раёнах — 25—29 градусаў. На працягу ўсяго тыдня вільготнае паветра з боку Чорнага мора будзе турбаваць нас дажджамі, месцамі з навальніцамі. Толькі 3 чэрвеня дажджы крыху адступяць і будуць назірацца галоўным чынам па паўднёваму захаду краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

Адпачынак

ЧЫРВОНАЯ ПАЛЯНА ЧАКАЕ БЕЛАРУСАЎ

Праз два тыдні першыя беларускія турысты прыбудуць у новенькі санаторны комплекс «Беларусь» у Чырвонай Паляне, што за 40 кіламетраў ад горада Сочы. Каб зразумець значнасць падзеі, трэба ведаць, што такое Чырвоная Паляна, што ў ёй асабліварга. Сама я ў гэтым месцы не была, але чула ад людзей, якія жывуць у Сочы. Цётка Ала Шафранская, у доме якой я з сям'ёй спыняюся вось ужо два гады запар, калі прыязджаю на мора, расказвала так:

— Тое, што там снег да лета — яшчэ не дзіва. Паветра горнае — таксама не дзіва. Але ёсць там рака, вада ў якой маленькімі кроплямі вырываецца вонкі і вісіць над паверхняй. Яна там настолькі мінеральная. Стаіш, глядзіш на гэтае дзіва і цябе ахоплівае адчуванне нерэальнасці...

Ведаеце, я вельмі люблю мора, Сочы і Дагамыс. Сочы — за цудоўныя халаднаватыя паркі з магноліямі і кіпарысамі, з букамі, грабамі, пальмамі і самшытам, Дагамыс (а гэта той жа Сочы) — за цудоўны пляж, вада на якім, дзякуючы гладкім каменьчыкам, захоўваецца празрыстай да вечара, колькі б людзей ні купалася. Ды і сам пляж вялізны, ніколі на ім не бывае цесна. І кожны раз, як уваходзіш у ваду, нібы апускаешся ў халаднаваты вадкі хрусталь, і ўзрушаная душа пяе Творцу гімн. Але самае галоўнае ў гэтым месцы — прырода. Там мясцовыя жыхары нават кофе вырошчваюць на сваіх агародах, побач з фінікамі, гранатамі, хурмой і фейхуа. Адным словам — субтропікі.

Дык вось, Чырвоная Паляна — гэта не толькі мора, і не толькі субтропікі. Гэта яшчэ і горы, і лес, і лугі, і мінеральныя крыніцы, і мяккі клімат, і, што не малаважна, — адасобленасць ад шумнага страката-га горада, разам з блізкасцю, зручнай сувяззю з ім і з аэрапортам. Усё гэта стварае ўнікальныя мясціны, падобных да якіх, кажуць, няма на зямлі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Шляхамі памяці

У Мінску гэтымі выхаднымі адбыўся велапрабег працягласцю 15 кіламетраў «Шляхамі памяці — за квітнеючую Беларусь!». Акцыя прымеркавана да Дня Незалежнасці нашай краіны і чарговай гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У ёй прынялі ўдзел больш за сто веласіпедыстаў: школьнікі, члены маладзёжнай ініцыятывы, курсанты Акадэміі МУС. Першымі ў калоне ехалі намеснік міністра ўнутраных спраў Віктар Філістовіч і галоўны аўтаінспектар краіны Аляксандр Мендзелеў.

Удзельнікі велапрабегу наведалі вёску Малы Трасцянец, дзе знаходзіцца Мемарыял загінулым у Вялікай Айчыннай вайне.

Паводле слоў намесніка міністра МУС Віктара Філістовіча, праведзеная акцыя — гэта яшчэ і знак павагі тым, хто сёння са зброяй у руках абараняе краіну. «Сёння мы ўшаноўваем і тых, — зазначыў Філістовіч, — хто загінуў і ў мірны час. Акцыя таксама накіравана на прыцягненне ўвагі да траўматызму на дарогах сярод дзяцей і моладзі».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Віцебшчына — «За незалежную Беларусь!»

У мінулую суботу там прайшоў чарговы этап рэспубліканскай акцыі

Не толькі ў цэнтры «культурнай сталіцы», але і ў мікрараёнах, установах адукацыі горада ў рамках акцыі былі арганізаваны самыя розныя мерапрыемствы.

А ў самым старажытным беларускім горадзе Полацку правядзенне акцыі супала з падрыхтоўкай да святкавання Дня нараджэння горада, якому ў пачатку чэрвеня споўніцца 1145 — гадоў. Цікава, што мясцовыя ўмельцы, а таксама добраахвотнікі з ліку гараджан, жыхароў іншых мясцін, нават з-за мяжы, зрабілі да гэтай падзеі гіганцкі абярэг агульнай плошчай болш за 70 квадратных метраў. Адна з работ была выканана з 1145 натуральных камянёў

Выпускнікі школ у апошні навучальны дзень выйшлі на парад разам з настаўнікамі, адбылося і тэатралізаванае дзейства, усё гэта і завяршалася акцыяй «За незалежную Беларусь», якая стала сапраўдным знакавым падарункам гораду-юбіляру.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ААБ «Беларусбанк» стварыў адзіную сістэму прафсаюзнага руху

Напрыканцы мінулага тыдня ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі адбылася першая рэспубліканская канферэнцыя аб'яднаннай прафсаюзнай арганізацыі ААБ «Беларусбанк», падчас якой была створана адзіная сістэма прафсаюзнага руху банка.

Трэба адзначыць той факт, што калі ў 2005 годзе ў банку было 11 пярвічных прафсаюзных арганізацый з колькасцю 4,5 тысячы чалавек, то ўжо сёлета функцыянуе 112 «пярвічак», дзе членамі прафсаюза з'яўляюцца больш за 25 тысяч чалавек.

З першых дзён сваёй дзейнасці аб'яднаны прафкам адчуў разуменне і падтрымку з боку праўлення банка і кіраўніцтва філіялаў. У выніку сумеснай работы працягваецца канструктыўны дыялог і канкрэтнае ўзаемадзеянне кіраўніцтва банка з прафсаюзнымі арганізацыямі. Распрацаваны і зацверджаны адзіны калектыўны дагавор, у якім прадугледжаны істотныя гарантыі для членаў прафсаюза.

Па памеру ўласнага капіталу доля аднаго з буйнейшых банкаў краіны ў банкаўскай сістэме на пачатак 2007 года складае 35 працэнтаў. Па гэтаму паказчыку ААБ «Беларусбанк» займае 16-е месца сярод банкаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і 261-е месца сярод банкаў Еўропы. Памер рэсурснай базы па стану на 1 мая 2007 года складае 13,5 трлн рублёў. Па памеру рэсурснай базы доля банка ў банкаўскай сістэме краіны складае 44 працэнты, а па памеру сродкаў насельніцтва — 62 працэнты.

Сяргей КУРКАЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

РОСТ ЗАРПЛАТЫ — ВЫШЭЙ ПРАГНОЗУ

Паводле даных Мінэканомікі краіны, намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата работнікаў у цэлым па рэспубліцы за студзень—красавік гэтага года склала 640,5 тысячы рублёў, ці 298,6 долара ЗША ў доларавым эквіваленце і павялічылася ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 18,5 працэнта, у тым ліку за красавік адпаведна — 661,9 тысячы рублёў, ці 308,4 долара і вырасла ў параўнанні з мінулагоднім красавіком на 18,5 працэнта, што ў межах тэмпаў росту, прадугледжаных прагнозам (рост на 2007 год — 15,6—18,8 працэнта).

У бюджэтнай сферы намінальная сярэднямесячная зарплата за сёлетнія студзень—красавік склала 581,2 тысячы рублёў, або 270,9 долара і павялічылася ў параўнанні з леташнімі студзенем—красавіком на 15,2 працэнта, у тым ліку за красавік — 599,3 тысячы рублёў, або 279,2 долара і вырасла ў параўнанні з красавіком 2006 года на 13,2 працэнта — у межах прагнозных тэмпаў росту (13,2—19 працэнтаў). Рэальная ж зарплата ў цэлым па краіне ў студзені—красавіку павысілася ў параўнанні з адпаведным мінулагоднім перыядам на 10,2 працэнта, а за красавік — на 10,3 працэнта, што вышэй прагнозу на гэты год (8—9 працэнтаў).

Ігар ГРЫШЫН.

АХВЯРЫ НАВАЛЬНІЦЫ

У ноч на панядзелак надзвычайнае здарэнне зафіксавана ў сталіцы, дзе загінулі двое непрацуючых мінчан: да бяды прывяла... навальніца.

Трагедыя здарылася ля дома № 7 па вуліцы Кахоўскай. Тут каля паловы першай ночы 45-гадовая і 20-гадовы сталічныя жыхары — маці і сын — былі смяротна траўмаваны электратокам: дрэва, што ўпала падчас навальніцы, абарвала провад, які «знайшоў» людзей.

Ігар ГРЫШЫН.

УРОН АД ВЕТРУ НЕВЯЛІКІ

За выхадныя дні ў сталічнай вобласці ў выніку шматразовага ўзмацнення ветру пацярпела 6 населеных пунктаў.

Паводле інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, у Крупскім раёне стыхія абрынулася на тры населеныя пункты. У горадзе, у прыватнасці, вецер часткова сарваў лісты шыферу з дахаў 20 жылых дамоў. З той жа праблемай сутыкнуліся ў пасёлку Бобр і ў Халопеніцкім сельскім Савеце, дзе адпаведна пацярпелі дахі цялятніка і збожжасховішча. У Уздзенскім раёне на тэрыторыі Цеплінскага сельскага Савета шыфер быў часткова сарваны з жылога дома, цялятніка, магазіна-склада і склада. У вёсцы Ванялевічы Капыльскага раёна былі пашкоджаны дахі гаража і майстэрні. Агульны ўрон ад моцнага ветру ва ўсіх пацярпелых населеных пунктах склаў прыблізна 1,5 мільёна рублёў

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЭЛЕКТРЫКА ЗАГУБІЛА АПОРА...

У Лунінецкім раёне электрык сельгасвытворчага прадпрыемства стаў ахвярай няшчаснага выпадку, паводле папярэдняй інфармацыі, спрабуючы выкрасці электракабель.

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, у вёсцы Дрэбск 47-гадовы мужчына паквапіўся на электракабель: аднак не вытрымала апора, якая падламалася і смяротна траўміравала электрыка.

Ігар ГРЫШЫН.

СЯРГЕЙ МАКАРАНКА — ГАНАРОВЫ ГРАМАДЗЯНІН БРЭСТА

Такое рашэнне прыняла сесія гарадскога Савета дэпутатаў, якая разгледзела просьбу ўпраўлення па фізічнай культуры, спорту і турызму гарвыканкама. Дэпутаты аднадушна выказаліся за тое, каб адзначыць выдатныя поспехі заслужанага майстра спорту, заслужанага трэнера Рэспублікі Беларусь, чэмпіёна Алімпіяды ў Рыме 1960 года па веславанні на каноэ, чэмпіёна Еўропы і свету.

Яна СВЕТАВА.

МАШЫНА АПЫНУЛАСЯ Ў ТРАНШЭІ

У сталіцы на праспекце Пераможцаў аўтамабіль «Міцубісі», якім кіраваў непрацуючы, трапіла ў ДТЗ.

Здарэнне адбылося на пачатку дванаццатай ночы. Вадзіцель не справіўся з кіраваннем і «Міцубісі», прабіўшы агароджу на ўчастку, дзе праводзяцца рамонтныя работы, упала ў траншэю. У выніку кіроўца і выкладчыца адной са школ, якая ехала ў аўто, былі змешчаны ў бальніцу, дзе, на жаль, жанчыну ўрачам выратаваць не ўдалося.

Аляксей ЦІТОЎ.

НЕЯДОМАЯ КАЎБАСКА

У Мінску папярэджана спроба запусціць у гандлёвую сетку сталіцы больш за тры з паловай тоны мясных вырабаў, якія маглі прынесці пакупнікам яшчэ тыя «ўражанні» пасля спажывання ў ежу.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў групе інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, кемлівы 27-гадовы экспедытар аднаго з таварыстваў з абмежаванай адказнасцю «падмалажваў» каўбаску і мясную прадукцыю, якая захоўвалася ў складскім памяшканні згаданага таварыства. Нікольні не клапоцячыся пра самаадчуванне пакупнікоў, дзялок наносіў новыя даты вырабу хадавога тавару, які затым павінен быў рэалізоўвацца. Як высветлілася пасля экспертызы Мінскага гарадскога Цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, прадукцыя аказалася неядомай — яна не магла выкарыстоўвацца для ежы. А таму каўбасная і мясная прадукцыя, вагой 3720 кілаграмаў і коштам 39 мільёнаў 400 тысяч рублёў, канфіскавана. Што ж датычыцца прадпрымальнага экспедытара, то Ленінскім РУУС у дачыненні да яго ўзбуджана крымінальная справа па ч. 1 артыкула 250 Крымінальнага Кодэкса — «Падман спажыўца».

Ігар ГРЫШЫН.

ЗА ТРЫ ДНІ ПАТАНУЛІ 8 ЧАЛАВЕК

На Віцебшчыне за мінулыя пятніцу — нядзелю патанулі 8 чалавек, у тым ліку 25 мая — адразу 5.

У Віцебску ў гэты дзень каля 11 гадзін патануў у рацэ навучэнец 9-га класа, у Верхнядзвінскім раёне патанула у возеры дзяўчынка 2002 года нараджэння, у Віцебскім раёне перакуліўся ў лодцы пенсіянер, 2 чалавекі загінулі ў Наваполацку — навучэнец ліцэя і беспрацоўны. 26 мая — у Віцебскім раёне патануў чалавек, а 27—га два беспрацоўныя — у Оршы і Аршанскім раёне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШКОЛЬНІКІ ЗАХВАРЭЛІ ДЫЗЕНТЭРЫЯЙ

Вучні Талачынскай сярэдняй школы № 1 (больш за 40) былі шпіталізаваны ў мясцовую бальніцу з дыягназам «дызентэрыя».

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, пры праверцы школы стала вядома, што тут з парушэннямі апрацоўвалі посуд у блоку харчавання, два супрацоўнікі сталі крыніцай распаўсюджвання інфекцыі, ды і вучні не асабліва ўдзялялі ўвагу асабістай гігіене. Зараз хворыя дзеці ідуць на папраўку. Большасць з іх — вучні пачатковых класаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УКРАІНА: ЕЎРОПА ВІНШУЕ, У РАСІІ ЗЛАРАДНІЧАЮЦЬ

ЕС, Савет Еўропы і яго Парламенцкая Асамблея павіншавалі ўкраінскіх палітыкаў з прыняццем дамоўленасці аб выхадзе з палітычнага крызісу. Вярхоўны камісар Еўрасаюза агульнай знешняй палітыкі і палітыкі бяспекі Хаўер Салана лічыць, што кампраміс «робіць пераможцамі ўсіх».

Між тым, французская Liberation піша, што «дуэль» Юшчанкі і Януковіча закончылася ўнічыю. Папярэдняе пагадненне аказалася з адным невядомым: датай выбараў. Прэзідэнт хацеў правесці іх летам, прэм'ер — у кастрычніку. Каб вывернуць рукі саперніку, прэзідэнт на мінулым тыдні зноў узяў ініцыятыву на сябе. У чацвер ён звольніў генеральнага пракурора, які лічыўся прыбліжаным прэм'ера. У пятніцу Юшчанка сваім указам узяў войскі міністэрства унутраных спраў пад асабістае камандаванне, а ў суботу дзве тысячы ваенных пачалі рух у бок Кіева, пакуль іх не заблакіравалі атрады міліцыі, верныя ўраду, піша газета. Адзначаючы, што «версія гвалтоўнага захопу ўлады не разглядалася ні разу», выданне лічыць, што менавіта ўзмацненне напружанасці прымусіла двух праціўнікаў сесці за стол перамоў. Іх вынік — датэрміновыя парламенцкія выбары прызначаныя на 30 верасня, Юшчанка часова прыпыняе дзеянне свайго ўказа аб роспуску, каб даць Радзе магчымасць прыняць серыю законаў аб фінансаванні выбараў.

«З непрыхаванай злараднасцю каментавала ў пятніцу расійская дзяржаўная радыёстанцыя «Маяк» працэсы, якія адбываюцца ва Украіне», — так характарызуе расійскую рэакцыю на вырашэнне палітычнага крызісу ва Украіне нямецкая Berliner Zeitung. Газета адзначае, што лейтматывам расійскіх каментарыяў стала тое, што «беззаконне, хаос, насілле чакаюць усіх, хто паспадзяваўшыся на Захад, выбера такую форму праўлення, якая адмовіцца ад вышэйшай арганізуючай сілы».

ЭСТОНСКІЯ ЎЛАДЫ ПАПОЎНІЛІ СПІСЫ ПЕРСОН НОН ГРАТА

Эстонскія ўлады папоўнілі спісы людзей, непажаданых для ўезду ў краіну, 2013 прозвішчамі.

Сярод патрапіўшых у «чорныя спічы» на першым месцы па колькасці аказаліся грамадзяне Расіі, далей ідуць асобы без грамадзянства, а таксама грамадзяне Украіны і Арменіі. Для 398 з іх устаноўлена пастаянная забарона, для астатніх — часовая.

ПОЛЬШЧА ПАГРАЖАЕ БЛАКІРАВАЦЬ УСТУПЛЕННЕ РАСІІ Ў СГА І СПЫНІЦЬ БУДАЎНІЦТВА ТРУБАПРАВОДАЎ З РФ

Польшча пагражае Расіі праблемамі пры ўступленні ў СГА ў выпадку, калі не ўдасца дасягнуць кампрамісу ў пытанні аб імпарце польскага мяса ў Расію, які зараз знаходзіцца пад забаронай. Аб гэтым заявіў прэзідэнт краіны. Былы міністр абароны пайшоў яшчэ далей і заклікаў, пакуль не позна, блакіраваць будаўніцтва Паўночна-Еўрапейскага газаправода.

«Калі Расія захавае бескампрамісную пазіцыю, як гэта было да гэтага часу, я не магу выключыць такога павароту падзей», — заявіў Лех Качыньскі ў інтэрв'ю швейцарскай газеце Neue Zurcher Zeitung.

Узгадваючы правальны самарскі саміт Расія-ЕС, былы міністр нацыянальнай абароны Польшчы Радэк Сікорскі раіць: «З набытым імі новым, больш ясным поглядам на Пуціна, канцлеру Германіі і Еўракамісіі пара адмяніць праект будаўніцтва Паўночна-Еўрапейскага газаправода паміж Расіяй і Германіяй пад Балтыкай. З'яўляючыся спробай Пуціна падзяліць ЕС і нанесці яму шкоду, гэты газапровад быў бы геапалітычнай катастрофай для Еўрасаюза».

БУШ УРЭЗАЎ ФІНАНСАВАННЕ РАСІЙСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ АПАЗІЦЫІ

У бюджэтным запыце на 2008 год фінансаванне арганізацый грамадзянскага грамадства ва Украіне, якія ўзначальвалі «аранжавую рэвалюцыю» ў 2004 годзе, скарочаны на 40 працэнтаў, а сродкі для Расіі — больш чым на 50 працэнтаў. Для Ліберыі і Косава адміністрацыя Буша запрасіла фінансавання больш, чым для РФ.

Традыцыі

У ПЕТУХОЎЦЫ БОГ ЖЫВЕ

У Чавускім раёне адзначылі свята Троіцы на святой крыніцы

Сёмуху — сем тыдняў пасля Вялікадня — у Петухоўцы, што ў Чавускім раёне, лічаць за свяе, так бы мовіць, грамадскае свята. Яно праходзіць каля Байкаўскай крыніцы, якую ў гэтых мясцінах называюць святой.

Крыніцы Байкава — гэта помнік прыроды, які ахоўваецца дзяржавай. Сюды на Троіцу традыцыйна прыязджае шмат людзей з навакольных вёсак, бліжэйшых раённых цэнтраў — Чавусаў і Чэрыкава, а таксама і з Магілёва. І ў гэтую нядзелю народу было зашмат. Каля крыніцы «прыпаркаваліся» і аўтамабілі, і фурманкі. Прыехала нават аўталаўка.

Сама крыніца знаходзіцца прама ў ляску, пад горкай. Там усталявана невялікая капліца, якая ўпрыгожана рушнікамі, выявамі святых і кветкамі. Людзі набіраюць ваду і могуць адразу папіць за сталом з белым абрусам.

Далей у яры цячэ ручэй, дзе можна абмыцца.

— Мы ідзём да крыніцы, паслухаем малітву, набяром вады і памыемся ў ручаі, — тлумачыць стараста Петухоўкі Анастасія Луцэіна. — Менавіта на свята Троіцы да нас у вёску прыязджаюць у госці сябры і сваякі.

Усе хаты ў Петухоўцы ўпрыгожылі свежымі галінкамі клёну. Пад нагамі ў дварах і пакоях — явар. Старадаўняя традыцыі Анастасія Васільеўна атрымала ў спадчыну ад сваёй бабулі Ефрасінні Іванаўны, якая пражыла 90 гадоў і памерла ў 1967-м. Яна расказвала ўнучцы, што крыніца была заўсёды і людзі лічылі яе гаючай. Менавіта каля яе тутэйшыя адзначалі Троіцу.

— Тры дні доўжыцца свята, і тры дні нельга прыбірацца ў хаце, — тлумачыць жанчына. — А галінкі клёну мы называем маем, таму што Троіца звычайна прыпадае на май. Мы гэты май збіраем, захоўваем, а потым палім на Купалу.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Прамая лінія

СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

На пытанні «прамой лініі» адказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Васільеўна ШЭМЕТАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 23, 24, 25 і 26 мая).

☎ — Ці прымаецца пад увагу пры разліку даходаў для атрымання бясплатнага харчавання на маленькіх дзяцей кошт ільготных лекаў?

Ганна Іванаўна ЯНОВІЧ і Ганна СЯДАЧ, *Мастоўскі раён*

— Згодна з новымі правіламі, пры вызначэнні ўзроўню даходаў для прадастаўлення бясплатнага харчавання на дзяцей першых 2 гадоў жыцця кошт ільготных лекаў не ўлічваецца.

☎ — Чула, што ў выпадку, калі адзін з бацькоў з'яўляецца інвалідам, дапамога па догляду на дзіця ва ўзросце больш за 3 гады можа прадастаўляцца без уліку даходаў. Гэта праўда?

Ларыса Мікалаеўна ВАРАБЕЙ, *Светлагорскі раён*

— Прапановы наконт умоў прызначэння дапамог на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады сем'ям, дзе ёсць бацькі-інваліды, зараз толькі разглядаюцца, і якім тут будзе канчатковае рашэнне — яшчэ невядома.

☎ — Ці можна адмовіцца ад пуцёўкі на аздараўленне дзіця-інваліда, а ўзяць замест яе кампенсацыю? І ці магу я афарміць догляд, калі дзіця-інвалід пойдзе ў звычайную школу?

Марына ШЫРВЕЛЬ, *Валожынскі раён*

— Выплата кампенсацыі замест нявыкарыстанай пуцёўкі на дзіця-інваліда зараз ужо не прадугледжваецца. Што ж да догляду дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, то ён афармляецца ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства, і гэта дапамога выплачваецца незалежна ад таго, пойдзе ваша дзіця ў звычайную школу ці не.

☎ — У нашай сям'і двое дзяцей, але хутка з'явіцца трэцяе. Ці праўда, што ў такім выпадку магчыма будзе «спісаць» не 30, а 50 працэнтаў льготнага крэдыту на будаўніцтва жылля?

Марына МАРТЫНЮК *г. Гродна*

— Сапраўды, Марына, такая прапанова падрыхтавана. Аднак пакуль яна яшчэ разглядаецца.

☎ — У нашай сям'і 6 чалавек, у тым ліку трое прыёмных дзяцей. Сама я ўжо выйшла на пенсію, муж — інвалід II групы. А нагода для званка такая. Мы ўсе разам жывём у саўгаснай прыватызаваній двухпакаёўцы, дзе немагчыма паставіць нават «лішні» ложак. У той жа час у гэтым жа доме ёсць пустая трохпакаёўка. Ці можам мы, як шматдзетная сям'я, разлічваць на атрыманне гэтай кватэры?

Таісія Аляксандраўна БУДЗЬКО, *Капыльскі раён*

— Справа ў тым, што ўсе пытанні наконт жылля вырашаюцца толькі на мясцовым узроўні. Таму, Таісія Аляксандраўна, у дадзеным выпадку трэба звярнуцца да кіраўніка гаспадаркі, старшыні сельскага Савета, старшыні райвыканкама. Бо ў рэшце рэшт у вас — прыёмная сям'я. І сёння такім сем'ям павінна надавацца асаблівая ўвага.

☎ — Ці магчыма мне, як шматдзетнай маці, якая жыве ў вёсцы і працуе тут у дзіцячым садку, разлічваць на вырашэнне «жыллёвага пытання» праз сельгаспрадпрыемства?

Яўгенія Валянцінаўна ІОДА, *Валожынскі раён*

— Калі шчыра, вырашыць «жыллёвае пытанне» праз сельгаспрадпрыемства наўрад ці рэальна — гаспадаркі ўкладваюць у будаўніцтва грошы і таму перш-наперш імкнуцца забяспечыць жылплошчай менавіта сваіх работнікаў. Таму трэба шукаць іншыя варыянты, скажам, звяртацца ў аддзел адукацыі, райвыканкам або ў аблвыканкам. Аднак у любым выпадку займацца гэтым трэба. Бо ў жыцці магчыма ўсё: сёння жылля няма, а заўтра можа распачацца будаўніцтва.

☎ — Паколькі я жыву ў рабочым інтэрнаце, да мяне не прапісваюць дзіця. Пры гэтым муж мае толькі часовую прапіску. У сувязі з гэтым наша сям'я не можа аформіць дапамогу на догляд. Што рабіць у такой сітуацыі?

Сняжана ГАРОДКА, *г. Мінск*

— У такой сітуацыі можна ўзяць ва ўрача-педыятра даведку, што дзіця назіраецца ў той ці іншай паліклініцы — такім чынам, атрымаецца пацвярджэнне, што дзіця пражывае разам з вамі. А далей трэба прадаставіць гэту даведку і неабходны пакет дакументаў па месцы сваёй работы ці месцы работы мужа, дзе, уласна кажучы, і прызначаць дапамогу на догляд.

Сяргей ГРЫБ.

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **72** дні

«У вашай газеты асаблівая місія»

Альберт Дабранскі, начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Маладзечанскаму раёну і падпісчык «Звязды» з больш чым 25-гадовым стажам дзеліцца думкамі з нагоды юбілею газеты.

Некалькі слоў пра суразмоўцу. Пазнаёміўся з ім яшчэ ў 1980 годзе. Першае, што тады запомнілася, яго выдатная, як кажуць, сакавітая размоўная беларуская мова. Я тады працаваў у газеце «Знамя юности» і ў камандзіроўках прывык да таго, што звычайна ўсе камсамольскія функцыянеры, нават і тыя, якія яшчэ ўчора вучыліся ў вясковых школах на беларускай мове, цяпер старанна размаўлялі па-руску. А вось першы сакратар Маладзечанскага райкама камсамолу Альберт Дабранскі з задавальненнем ужываў матчыну мову. Яна з яго вуснаў гучала натуральна, арганічна і прыгожа. На мове ён заўсёды, колькі памятаю, лічыў за лепшае абмяркоўваць навінкі беларускай літаратуры, публіцыстыкі, вершы знаёмых паэтаў, аналітычныя артыкулы ў друку, у тым ліку і ў «Звяздзе».

— Альберт Іосіфавіч, адкуль такая адданасць «Звяздзе»?

— Я ўвогуле люблю чытаць беларускія выданні. Яшчэ камсамольцам некалькі гадоў запар выпісваў «Чырвоную змену». Потым, калі выйшаў з камсамольскага ўзросту, пераключыўся на «Звязду». З таго часу з ёй не развітваюся. А некалькі гадоў таму спаткаўся з «Чырвонкай». Праўда, ужо ў якасці дадатку да вашай газеты. Такім чынам маю ў адным камплекце два цікавыя выданні. Мяне гэта задавальняе.

— Ад нашых агульных знаёмых чуў, што вы, калі працавалі першым сакратаром Маладзечанскага райкама камсамолу, насуперак традыцыям праводзіць пленумы на рускай мове па ўласнай ініцыятыве пачалі рабіць гэта на беларускай мове. Ці так?

— Сапраўды, у свой час я прапанаваў камсамольскаму актыву раёна правесці чарговы пленум на беларускай мове. Мяне падтрымалі. Мой беларускамоўны даклад выступоўцы таксама абмяркоўвалі па-беларуску. Наколькі я памятаю, яны веданне мовы асвяжалі чытаннем беларускамоўных газет, той жа «Звязды». І такім чынам мы правялі некалькі пленумаў. Затым традыцыя праводзіць маладзёжныя мерапрыемствы на рускай мове, на жаль, перамагла. Мы моцна вылучаліся на агульным фоне і нас пачалі «не разумець».

Хоць, мушу заўважыць, юнакі і дзяўчаты той пары ахвотна размаўлялі па-беларуску. Відаць, таму, што маё пакаленне новых гараджан было пераважна з вёскі, яго прадстаўнікі адчувалі ў гарадах тугу па малой радзіме, яе культуры, традыцыях, звычках, мове.

Я, напрыклад, з Мядзельшчыны, з вёскі Баяры. Яна і сёння ўяўляе адзін з такіх куткоў, дзе наша мова жыве, паважаецца і ўжываецца. Я люблю туды прыязджаць, сустракацца з землякамі, размаўляць з імі па-беларуску. Дарэчы, Мядзельская зямля дала нямала знакамітых дзеячаў беларускай культуры. Я, скажам, хадзіў у адну школу з Максімам Танкам, праўда, у розныя гады. Яго родная Пількаўшчына знаходзіцца за 12 кіламетраў ад Баяраў. Мая зямлячка народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч цудоўна валодае роднай мовай, сваім жыццём і творчасцю дае іншым прыклад шанаваць усё беларускае.

— У гэтым сэнсе якой вам падаецца роля адзінай беларускамоўнай штодзённай газеты «Звязда»?

— Адказ утрымліваецца ў вашым пытанні. Тое, што «Звязда» з'яўляецца адзінай беларускамоўнай штодзённай газетай, гаворыць пра многае, у тым ліку і пра асаблівую місію вашай рэдакцыі па захоўванню беларускай мовы.

— А як вы ставіцеся да крытыкі на старонках «Звязды»?

— Я лічу, што ў кожным выданні павінен захоўвацца баланс крытычных і некрытычных матэрыялаў. Бо, скажу шчыра, калі ў газеце рэгулярна перабольшвае негатыў, няхай і заснаваны на праверэных фактах, рэальных дакументах, то з часам усё роўна ўсё менш узнікае жадання браць яе ў рукі. Што датычыцца «Звязды», то яна апошнім часам, на мой погляд, не вельмі грашыць крытычнымі публікацыямі. Я б вам параіў узмацніць гэты накірунак, бо, памятаю, некалі звяздоўскія «вострыя» матэрыялы з канструктыўнай крытыкай станавіліся прадметам абмеркавання як шырокіх колаў чытачоў, так і ў дзяржаўных установах і органах. Гэту традыцыю варта было б адрадзіць. На мой погляд, 90-годдзе «Звязды» — вадатная нагода для шырокай гутаркі аб нашай культуры, лёсе беларускай мовы, шляхах яе захавання, праблемах выжывання ў рынкавых умовах беларускамоўных выданняў.

НЕ СЕМ ДЗЁН, А СЕМ МЕСЯЦАЎ

Канцэртная пляцоўка Летняга амфітэатра ў Віцебску павінна быць задзейнічана сем месяцаў у годзе. Такую задачу перад Міністэрствам культуры паставіў намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусі Аляксандр Косінец, які прымаў удзел у пасяджэнні рабочага штаба па рэканструкцыі галоўнай канцэртнай пляцоўкі фестывалю.

У гэтым годзе канцэрты «Славянскага базару ў Віцебску», як чакаецца, наведаюць больш як 40 тыс. гледачоў. На арганізацыю і правядзенне фестывалю будзе накіравана Br3,6 млрд. У тым ліку распараджэннем кіраўніка дзяржавы выдзелена Br1,7 млрд з бюджэту Саюзнай дзяржавы, з боку Беларусі паступіць Br1,2 млрд, ад Расіі — Br700 млн. Міністэрства культуры Беларусі накіруе Br70 млн.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

Гульня № 1

КУБАК НА ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

падарыў сабе і аднаклубнікам варатар брэсцкага «Дынама» Юрый Цыгалка

Напярэдадні фіналу фаварытамі, без сумненняў, лічыліся падначаленыя Ігара Крыўшэнкі: усё ж такі яны дзесяты раз запар выйшаў з камсамольскага ўзросту, пераключыўся на «Звязду». З таго часу з ёй не развітваюся. А некалькі гадоў таму спаткаўся з «Чырвонкай». Праўда, ужо ў якасці дадатку да вашай газеты. Такім чынам маю ў адным камплекце два цікавыя выданні. Мяне гэта задавальняе.

— Ад нашых агульных знаёмых чуў, што вы, калі працавалі першым сакратаром Маладзечанскага райкама камсамолу, насуперак традыцыям праводзіць пленумы на рускай мове па ўласнай ініцыятыве пачалі рабіць гэта на беларускай мове. Ці так?

— Сапраўды, у свой час я прапанаваў камсамольскаму актыву раёна правесці чарговы пленум на беларускай мове. Мяне падтрымалі. Мой беларускамоўны даклад выступоўцы таксама абмяркоўвалі па-беларуску. Наколькі я памятаю, яны веданне мовы асвяжалі чытаннем беларускамоўных газет, той жа «Звязды». І такім чынам мы правялі некалькі пленумаў. Затым традыцыя праводзіць маладзёжныя мерапрыемствы на рускай мове, на жаль, перамагла. Мы моцна вылучаліся на агульным фоне і нас пачалі «не разумець».

Хоць, мушу заўважыць, юнакі і дзяўчаты той пары ахвотна размаўлялі па-беларуску. Відаць, таму, што маё пакаленне новых гараджан было пераважна з вёскі, яго прадстаўнікі адчувалі ў гарадах тугу па малой радзіме, яе культуры, традыцыях, звычках, мове.

Я, напрыклад, з Мядзельшчыны, з вёскі Баяры. Яна і сёння ўяўляе адзін з такіх куткоў, дзе наша мова жыве, паважаецца і ўжываецца. Я люблю туды прыязджаць, сустракацца з землякамі, размаўляць з імі па-беларуску. Дарэчы, Мядзельская зямля дала нямала знакамітых дзеячаў беларускай культуры. Я, скажам, хадзіў у адну школу з Максімам Танкам, праўда, у розныя гады. Яго родная Пількаўшчына знаходзіцца за 12 кіламетраў ад Баяраў. Мая зямлячка народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч цудоўна валодае роднай мовай, сваім жыццём і творчасцю дае іншым прыклад шанаваць усё беларускае.

— У гэтым сэнсе якой вам падаецца роля адзінай беларускамоўнай штодзённай газеты «Звязда»?

— Адказ утрымліваецца ў вашым пытанні. Тое, што «Звязда» з'яўляецца адзінай беларускамоўнай штодзённай газетай, гаворыць пра многае, у тым ліку і пра асаблівую місію вашай рэдакцыі па захоўванню беларускай мовы.

— А як вы ставіцеся да крытыкі на старонках «Звязды»?

— Я лічу, што ў кожным выданні павінен захоўвацца баланс крытычных і некрытычных матэрыялаў. Бо, скажу шчыра, калі ў газеце рэгулярна перабольшвае негатыў, няхай і заснаваны на праверэных фактах, рэальных дакументах, то з часам усё роўна ўсё менш узнікае жадання браць яе ў рукі. Што датычыцца «Звязды», то яна апошнім часам, на мой погляд, не вельмі грашыць крытычнымі публікацыямі. Я б вам параіў узмацніць гэты накірунак, бо, памятаю, некалі звяздоўскія «вострыя» матэрыялы з канструктыўнай крытыкай станавіліся прадметам абмеркавання як шырокіх колаў чытачоў, так і ў дзяржаўных установах і органах. Гэту традыцыю варта было б адрадзіць. На мой погляд, 90-годдзе «Звязды» — вадатная нагода для шырокай гутаркі аб нашай культуры, лёсе беларускай мовы, шляхах яе захавання, праблемах выжывання ў рынкавых умовах беларускамоўных выданняў.

Фота БЕЛТА

Галоўны трэнер «Дынама» (Брэст) Уладзімір ГЕВАРКЯН і капітан каманды Віктар СОКАЛ.

Падзея стала магчымай дзякуючы дынамічнаму развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Італіяй. Гаворка ідзе аб прадстаўленні інтарэсаў не толькі самога банка, але і беларускіх прадпрыемстваў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у Італіі і іншых краінах Еўропы. Прадстаўніцтва будзе садзейнічаць рэалізацыі камерцыйных і інвестыцыйных праектаў, стварэнню аптымальных фінансавых умоў для беларускіх вытворцаў, якія намагаюцца нарошчваць пастаўкі айчыннай прадукцыі на італьянскі рынак. У межах праграмы адкрыцця прадстаўніцтва былі падпісаны пагадненні з шэрагам фінансава-крэдытных арганізацый Еўропы па пашырэнню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і дадатковаму прыцягненню ў эканоміку Беларусі крэдытных рэсурсаў за мяжы.

Дарэчы, летась ААТ «Белаграпрамбанк» арганізаваў фінансаванне больш чым 300 камерцыйных і інвестыцыйных праектаў, якія рэалізаваліся кліентамі банка з удзелам замежных партнёраў, і прыцягнуў у эканоміку краіны сродкі замежных банкаў у памеры 340 мільёнаў долараў. У сёлетніх планах банка — прыцягненне не менш як 500 мільёнаў долараў знешніх крыніц фінансавання.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ААТ «Белаграпрамбанк»: прадстаўніцтва ў Італіі

У Мілане адкрылася прадстаўніцтва ААТ «Белаграпрамбанк» — першае прадстаўніцтва беларускага банка ў Італіі.

ЧЫРВОНАЯ ПАЛЯНА ЧАКАЕ БЕЛАРУСАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Чырвоная Паляна знаходзіцца за паўкіламетра над ўзроўнем мора, у даліне самай вялікай горнай ракі Сочынскага Прычарнамор'я — Мзымты. Ад халодных вятроў яе закрывае Галоўны Каўказскі хрыбет, з усходу ўстае пяцігаловы Аігба, на захадзе — хрыбет Ачышхо. З поўдня, праз хрыбет Алек і цясніну Ах-цу падымаецца прагрэтае, але ўжо не гарачае марское паветра. Таму тут не бывае дрэннага надвор'я: летам няма спёкі, зімой — каля нуля і глыбокі, пушысты снег да сакавіка—мая. На схілах гор — калхідскі лес — каўказскія джунглі, у якіх сярод буку, грабу і дубу цвіце каштан — мясцовыя жыхары збіраюць яго і здаюць на кандытарскую фабрыку.

На пачатку XIX стагоддзя тут жылі сем'і чаркесаў, якіх называлі агульным імем — медавеі. Менавіта ў Чырвонай Паляне (на той час Ачыпсоу) у 1864-м скончылася Каўказская вайна, у выніку якой Расія атрымала выхад да Чорнага мора і далучыла Каўказ. Тады чаркесы вымушаны былі адсюль з'ехаць, а рускія вайскоўцы заклалі ў памяць перамогі сяло Раманаўск, называлі яго таксама Царская Паляна. Некаторы час Раманаўск пуставаў, пакуль пра яго не даведалася стаўрапольская калонія грэкаў-пераселенцаў. Калі грэчаскія хадакі пераадолелі перавал, ім адкрылася Царская Паляна ў чырвона-карычневых тонах: восенню такі колер набывае тут лісце папараці, скумпіі і чарэшні. Грэкі засталіся і далі Паляне новую назву — Чырвоная.

За шэсць кіламетраў вышэй па Мзымце здаўна пасяліліся эстонцы, назваўшы сваё сяло Эсто-Садок. У гэтым сяле пасля рэвалюцыі быў створаны гадавальнік па развядзенню пчол, які зараз уваходзіць у склад навукова-даследчага інстытута пчалярства пры Расійскай акадэміі навук. Сёння ніводны турыст не з'язджае адсюль не адведаўшы славутага горнага, трошкі гаркаватага на смак, мёду.

Апошняе дзесяцігоддзе Чырвоная Паляна імкліва развіваецца як горналіжны курорт сусветнага маштабу. Акрамя горна-лыжнага комплексу, гатэляў, рэстаранаў, крам, пунктаў пракату, тут пабудавана канатная дарога, якая абслугоўвае самы вялікі ў Расіі перапад вышынь: з 540 да 2238 метраў. Верхняя станцыя «канаткі» з'яўляецца адзіным поўным высакагорным далягляда на Каўказе, які даступны для масавага турызму: тут адкрываецца панарама на 100 кіламетраў наперад і на 360 градусаў навокал.

А што датычыцца мінеральных крыніц, мноства якіх знаходзіцца вакол Чырвонай Паляны, то па свайму складу некаторыя з іх вельмі падобныя на мінеральныя воды баржомі, есентукі і нарзан. У вярхоўі Мзымты знаходзіцца «Даліна нарзанаў», дзе знойдзена каля 120 выхадаў мінеральных водаў. Тут цячэ кіпячы ад газаў ручай (напэўна, пра яго расказвала цёткa Ала Шафранская). Крыніцы мінеральнай вады ствараюць у ім суцэльнае вірaванне. Яшчэ вышэй — азярцо, з дна якога бясконца падымаюцца срэбныя бурбалкі. Яшчэ за 30 метраў ад берага Мзымты — крыніца з настолькі моцна газаванай вадой, што побач немагчыма запаліць агонь. Гэтыя воды выкарыстоўваюць для лячэння хвароб скуры, сардэчна-сасудзістай сістэмы, органаў кровазвароту, цэнтральнай і перыферычнай нервовай сістэмы, апорна-рухальнага апарата, у гінекалогіі і пры нейра-эндакрынных парушэннях.

Усё гэта толькі некаторыя рысачкі пра Чырвоную Паляну. Думаю, каб даведацца цалкам, што гэта такое, трэба там пабываць і, напэўна, не аднойчы.

Цяпер беларусы маюць такую магчымасць. У сярэдзіне чэрвеня стартуе першы заезд у санаторны комплекс «Беларусь». Гатэль разлічаны на 70 чалавек, мае нумары палепшанай планіроўкі ад эканомкласа да VIP-апартаментаў з сучаснай мэбляй, кандыцыянерам і ўсёй «чатырохзоркавай» камплектацыяй. У пуцёўку ўваходзіць пражыванне ў гатэлі, харчаванне (сняданак і вячэра), трансфер з аэрапорта і да аэрапорта, а таксама трансфер на пляж і з пляжа, карыстанне басейнам, трэнажорнай залай, валейбольнай і баскетбольнай пляцоўкамі, наведванне саўны і дыскатэкі, і нават турніры па більярду і настольнаму тэнісу. Турыстам таксама будуць прапанаваны рафтынг па Мзымце, джыпінг-туры, наведванне фарэльнай гаспадаркі і страўсінай фермы, вандроўка па начным Сочы, экскурсіі па наваколлю на горных веласіпедах або конях...

Комплекс «Беларусь» ужо ўнесены ў афіцыйны каталог Сочынскай Алімпіяды і, як мяркуецца, будзе месцам размяшчэння і трэніровак беларускай зборнай па фрыстайлу і горных лыжах. А цяпер кожны жадаючы можа пабываць тут раней за алімпійцаў, убачыць усё сваімі вачамі і зведаць на сабе дзеянне тутэйшых лекавых паветра, вады і прыгажосці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Крымінал

ЗБРОЕВЫХ СПРАЎ МАЙСТАР

У Брэсце супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю па Брэсцкай вобласці і аддзела крымінальнага вышуку Камянецкага РАУС выявілі падпольнага збройніка.

У доме 42-гадовага мужчыны праваахоўнікі знайшлі не толькі ўнушальны арсенал зброі, але і абсталяванне для яе вырабу і рамонту. У прыватнасці, канфіскаваную «калекцыю» складалі рэвальвер сістэмы «Наган», дзве малакаліберныя вінтоўкі, паляўнічы карабін калібру 7,62 мм, тры аптычныя прыцэлы «ПСО-1», два паляўнічыя ружжы, пяць прыстасаванняў саматужнай вытворчасці для бясшумнай стральбы, 807 патронаў рознага калібру, дзевяць магазінаў і больш за 200 найменняў частак і механізмаў для розных тыпаў зброі.

Ігар ГРЫШЫН.

СУД ДЫ СПРАВА КАЛІНЫ

Сёння ў Першамайскім судзе сталіцы пачнецца суд над выканаўцам шансона Віктарам Калінам і ягонай жонкай Святланай. Паводле даных МУС, спявак абвінавачваецца адразу па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса: арганізацыя махлярства ў асабліва буйным памеры, арганізацыя заведама лжывага даносу і заведама лжывае паказанне. Святлане Каліна інкрымінуюць махлярства ў асабліва буйным памеры. Пры гэтым спявак зараз знаходзіцца пад вартай, а яго жонка яшчэ напрыканцы лютага была адпушчана са следчага ізалятара пад залог.

Нагадаем, 27 снежня мінулага года Святлана Каліна была затрымана ў банкаўскім офісе пры спробе атрымаць страхоўку на суму больш як 71 мільён беларускіх рублёў за аўтамабіль «Мерсэдэс», які нібыта быў скрадзены ў Маскве. Супрацоўнікі праваахоўных органаў высветлілі, што машына была прададзена самой уладальніцай — і аўтамабіль увогуле не пакідаў межаў Беларусі. Следчыя прыйшлі да высновы, што ўгон аўто быў змітаваны гаспадарамі з мэтай атрымання страхоўкі. У хуткім часе за кратамі апынуўся і Віктар Каліна, які падчас следства з простага ўдзельніка страхавой махінацыі ператварыўся ў арганізатара махлярства ў асабліва буйным памеры і, аднойчы адпушчаны пад падпіску аб нявыездзе, неўзабаве зноў трапіў за краты.

Між тым Святлана Каліна сцвярджае, што яна і яе муж не вінаватыя, і спадзяюцца на станоўчы вынік судовага працэсу. «Мне хацелася б верыць, што суд будзе аб'ектыўным, справядлівым і непрадузятым», — сказала жанчына. Паводле яе слоў, «самыя лепшыя песні Віктара Каліны яшчэ наперадзе». Нібыта ў доказ таго, што ў іх усё нармальна, Святлана наладзіла выпуск канцэртнага DVD «Віктар Каліна і яго сябры» — паводле запісу канцэрта памяці вядомага расійскага шансанье Міхаіла Круга, што адбыўся летась у Мінску. Віктар Каліна быў арганізатарам канцэрта, у якім удзельнічалі таксама многія расійскія выканаўцы. Дарэчы, адначасова з канцэртным дыскам у продаж паступіў дэбютны альбом беларускага шансанье Андрэя Моргана «Чужая жонка», у які ўвайшлі некалькі песень, напісаных Віктарам Калінам, і адна — Сяргеем Сухамліным.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

З НАЖОМ — НА МІЛІЦЫЮ

Сямейны скандаліст да таго раскачагарыўся на алкагольнай глебе, што яго жонка вымушана была выбегчы з кватэры. Але там заставалася яшчэ дачка, якой магла пагражаць небяспека. Таму жанчына і звярнулася ў міліцыю, адкуль на кватэру для ўтаймавання мужчыны адправіліся два ахоўнікі парадку.

Дэбашыр там часам, трымаючы нож у руках, нечаму «павучаў» дачку на кухні, і калі ўбачыў, што жонка прывяла двух міліцыянераў, разбіў шкло на кухні і пачаў «абстрэльваць» іх асколкамі. Параніўшы аднаго з міліцыянераў, раптоўна кінуўся на яго з нажом, але той ухіліўся ад удару. Праз 15—20 хвілін на патрабаванне выдаць нож хуліган зноў пусціў у ход асколкі шкла, а затым, ужо з двума нажамі, пайшоў у атаку на міліцыянераў, якія выклікалі падмогу. Вось толькі тады, пасля адпавядных дзеянняў, скандаліст вымушаны быў здацца. Усё гэта адбылося ў Гомелі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

У ПЕТУХОЎЦЫ БОГ ЖЫВЕ

Стараста Петухоўкі Анастасія ЛУЦЭЙНА разам з сяброўкамі на свяце Байкаўскай крыніцы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле таксама старадаўняга звычаю, петухоўцы да крыніцы не ездзяць. Яны ходзяць туды пешшу: пераходзяць па мастках Проню і ідуць па лузе. Шлях, дарэчы, няблізкі: каля двух кіламетраў. Аднак традыцыя гаворыць: трэба ісці ціхенька (маўляў, і так усё жыццё спяшаемся!) і атрымліваць асалоду ад маляўнічых краявідаў. «Трэба бачыць цудоўнае вакол нас!» — гавораць жыхары вёскі.

Раней, расказвае Анастасія Васільеўна, у Петухоўцы жыў дзед, які быў дыяканам яшчэ да вайны. Звычайна ён вёў богаслужэнне ля крыніцы. Цяпер дзеда няма, і на свята прыязджае святар з вёскі Благавічы — айцец Міхаіл. Ён і сёлета асвяціў ваду, прамовіў праваслаўным пра любоў да Бога і адзін да аднаго.

Прыгожыя дзяўчаты з Антонаўскага дома культуры расказвалі каля крыніцы пра Троіцу — свята сонца, зямлі і вады, а потым пусцілі па ручаі свае вяночкі з маладых бярозавых галінак. Ім падпявалі прыгожыя бабулькі з ансамбля «Незабудкі» з вёскі Галавенчыцы. Спевы рэхам разносіліся па лузе далёка-далёка.

Валянціна Сяргееўна Дарашэнка расказвае, што ў тыя далёкія часіны, калі Петухоўка «дрыжэла ад людзей» (сёння тут жыве толькі 63 чалавекі), святая крыніца была прама ў вёсцы. Паводле падання, аднойчы цыганка памыла ў ёй пялюшкі, і крыніца знікла. Аднак не проста знікла, а «перабралася» непадалёк, за лес.

— Гэты лес здаўна называецца Архіпавым, — растлумачыла бабуля. — Таму што ён належаў заможнаму Архіпу, які знішчыў капліцу над крыніцай і ўсталяваў тут млын. І як паставіў, дык адразу злёг у ложак. Добрыя людзі яму сказалі, што будзе хварэць, калі не прыбярэ з крыніцы млын. І ён загадаў аднавіць капліцу. Так нашы дзяды распавядалі.

Валянціна Сяргееўна ўзгадвае, што ў савецкі час, у 1960-я гады крыніцу хацелі зачыніць, закласці плітамі. Тады разламалі капліцу і папалілі крыжы. Але знішчыць крыніцу канчаткова не далі мясцовыя жыхары: паднялі крык на ўсю акругу, і ўлады вымушаны былі пакінуць у спакоі святое для людзей месца.

— Тут сапраўды гаючая вада, — пераконвае бабуля Дарашэнка. — У мяне хворыя ногі былі, і аднойчы я адстаяла ў ручаі ўсё святочнае богаслужэнне. І нічога не стала. А то ж не магла нават вынесці ежу свінням... Во, паверце!

— Ёсць у гэтай вадзе нейкая сіла, — лічыць Анастасія Луцэіна. — Некалькі гадоў можа прайсці, і не будзе ў ёй ані паху, ані асадку. Мы ёй карыстаемся, калі дзіця спужалася і трэба пашаптаць. У святы раніцай карысна выпіць гэтай вады.

Пасля паходу да крыніцы — традыцыйнае застолле, як і на Вялікдзень. Усе лепшыя стравы гаспадыні гатуюць і выстаўляюць дарагім гасцям. Бліны з печкі разам з сырам хатняга прыгатавання — вельмі смачна!

Сталы стаяць у дварах альбо ідуць да дуба на бераг Проні. Гэта дрэва — яшчэ адна славутасць Петухоўкі. Пра яго гавораць, што яно дае кожнаму, хто сеў каля яго аднапачыць, сілу і энергію. Жанчыны расказваюць, што ў час сенакосу, калі на полі няма дзе схавацца ад сонца, яны часта ідуць да дрэва, адпачываюць пад цяністымі галінамі і сцвярджаюць, што дуб сапраўды вяртае ім бадзёрасць.

За святочным сталом на Троіцу петухоўскія жанчыны спяваюць народныя песні. Толькі не сумныя, а менавіта вясёлыя.

— Гэта ж радасць, што мы дажылі да Троіцы, памыліся пасвяцонай вадой, — весела тлумачаць вяскоўцы. — Святар гаворыць, што вада з нашай крыніцы год захоўвае гаючыя ўласцівасці.

— Святыя месцы мы беражом, — запэўнівае старшыня Антонаўскага сельвыканкама Таццяна Палеонак. — Ёсць у нас яшчэ і ў Загорынцы крынічка, дзе свята праходзіць на Міколу. У Галавенчыцах, дзе ў старажытнасці была царква, летась паставілі памятны крыж. На ўездзе ў цэнтр сельсавета Антонаўку ўсталявалі крыж. Я лічу, што трэба вярнуцца да традыцый і адрадзіць такія цудоўныя святы, як на Байкаўскай крыніцы.

Дарэчы, самай папулярнай тэмай на свяце — пад засценню дрэў і каля халоднай вады — было, канешне, спякотнае надвор'е. Аднак яно пакуль не вельмі пужае аматарак агародаў і палёў з Петухоўкі. Жанчыны лічаць, што пакуль вільгаці ў глебе хапае, а яны самі яшчэ грэюцца. Аднак усё ж даждж чакаюць.

— Сёння павінен дождж быць, таму што вялікай расы раніцай не было, — дзеляцца народнымі прагнозамі бабулі. — Але калі не будзе — дык на нашу зямлю яшчэ хопіць. Толькі ж пасадзілі апошнія капусту і агуркі. Бог у Петухоўцы жыве. І жадаем усім моцнага здароўя, зямнога багацця і жыццёвай радасці.

А бабулі, дарэчы, мелі рацыю: увечары над Магілёўшчынай пранеслася навальніца з асвяжальным дажджом.

Ілона ІВАНОВА.

Чавускі раён.

Бессардэчнасць адрозненняў

Падставай для напісання гэтага матэрыялу сталі два пісьмы. Аўтарам аднаго з іх з'яўляецца дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вольга Абрамава. У ім яна выклала сваю пазіцыю ў адносінах да падзей апошняга часу ў Эстоніі і рэакцыю на іх Захаду і накіравала яго паслам усіх краін Еўрапейскага саюза, акрэдытаваным у Беларусі. Другое пісьмо — адказ пасла Вялікабрытаніі ў Беларусі Браяна Бенета (адзінага, хто адказаў на пасланне дэпутата).

Сутнасць дэпутацкай ініцыятывы зводзілася да таго, што, на яе думку, «з цывілізатарскай місіяй еўрапейцаў на постсавецкай прасторы ў бліжэйшыя гады будуць праблемы», таму што «ўрады заходніх дзяржаў так і не зразумелі спецыфікі ментальнасці на крайняй меры славянскай часткі былога Савецкага Саюза», важнейшай рысай якой было «знаходзіць вытокі нацыянальнай гордасці ў вызваленчых войнах». Дэпутат асабліва падкрэслівае, што «рускія, беларусы і ўкраінцы ў Савецкім Саюзе самасцвярджаліся ў разуменні асобай місіі па выратаванню сваёй краіны і ўсёй Еўропы ад фашызму».

На падставе гэтага пісьма робіцца выснова: «Пасля падзей апошняга часу ў Эстоніі і своеасаблівай рэакцыі на іх заходняй дыпламаты і заходніх урадаў мала хто на нашай геапалітычнай прасторы паверыць у неабходнасць будучай перамогі ідэалаў дэмакратыі ў еўрапейскай версіі ў нашых дзяржавах».

Спадар Браян Бенет, адказваючы на пісьмо, мабыць, спрабаваў паказаць свае філасофскія здольнасці, ахарактарызаваўшы яго як зварот «у сэрцы адрозненняў у нашых поглядах на свет», падмацаваўшы гэта вось такой сентэнцыяй: Беларусь глядзіць у мінулае, Брытанія — у будучыню. «Першае важнае адрозненне, — піша пасол, — заключаецца ў тым, што мы не надаём такой значнай увагі перамозе (у Другой сусветнай вайне). У вайне няма пераможцаў, мы ўсе прайгралі. Вынікам вайны стаў тэхналагічны і сацыяльны прагрэс, але цана яго была вялізнай і павінна ўсімі лічыцца пройгрышам».

Брытанскі пасол, відаць, свядома забыўся ці проста не ведае, што «Беларусь глядзіць у мінулае», у тым ліку і ваеннае, свята шануе памяць воінаў і па той прычыне, што практычна ў кожнай сям'і былі ахвяры — муж, бацька, брат, сястра, сын, дачка... Загінуў кожны трэці жыхар рэспублікі. Ці можна гэта забыць?

Браян Бенет «не надае такой значнай увагі перамозе», мабыць, і яшчэ па адной вельмі простай прычыне. У інтэрв'ю аднаму з апазіцыйных беларускіх выданняў ён, разважаючы аб астраўным размяшчэнні каралеўства, у ліку пазітыўных асаблівасцяў адзначыў тое, што брытанцы «былі дастаткова абаронены ад нападаў у тыя часы, калі войны з'яўляліся нормай існавання». Беларусь жа вада не абараняла. Па яе тэрыторыі з захаду на ўсход і ў адваротным накірунку за шматвяковую гісторыю прайшлі мільёны непрыяцельскіх воінаў з адной толькі мэтай — захапіць гэту зямлю і заняволіць яе жыхароў. Не ў крыўду кажучы спадару паслу,

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

«Пагода ў доме»-3

Трэці класіфікацыйны конкурс на прызы Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (дырэктар Канстанцін Міхайлавіч Барэль) і з нормай першага спартыўнага разраду па шашках завяршаем заданнем № 12:



БЕЛЫЯ: c1, d4, e3, f2 (4). ЧОРНЫЯ: a3, f6, дамка b4 (3). Нічыя.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

Калектыў — арганізатар конкурсу — прысвячае яго 90-годдзю газеты «Звязда».

Вынікі конкурсу

Лаўрэатамі конкурсу «Пастаўская паляна»-3 сталі Валерый ГАЎРЫШ (в. Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна), Васіль ГРАБЕНКА (Мінск), Уладзімір САПЯЖЫНСКІ (Рагачоў), Іван ПРАЦУК і Уладзімір ПУШКІН (Паставы), Пётр ШКЛУДАЎ (Наваполацк) і сярод жанчын — Ірына КАЛАЧОВА (в. Зарэцкія Пастаўскага раёна). Яны набралі па 30 ачкоў і будуць прэміраваны. Адзначаюцца таксама суддзя конкурсу Мікалай ГРУШЭЎСКІ і каардынатар спаборніцтваў Яўген ЛЯХАЎ.

Далей табліца выглядае такім чынам: А. Агіевіч, І. Астроўскі, У. Аўласенка, А. і І. Ашыхміны, У. Бандарык, Алена Булаўка, І. Буяк, Л. Вітошкін, В. Голас, Аляксандра Камінская, Д. Камчыцкі, А. Кіслы, К. Козел, І. Мацкевіч, А. Перавознікаў, А. Пярхальскі, А. Рогач, А. Свірко, Д. Семянюк, Р. Сідарчук, В. Талкачоў, У. Ціханаў, Дзіяна Шаўчук і А. Янчук (па 29 ачкоў), М. Клязовіч (24), К. і М. Барэлі і А. Зарэцкі (па 22), Э. Арльт (12), С. Гурыновіч, Ніна Зайцава і М. Трухан (па 1).

Пераможцы конкурсу пацвердзілі сваё высокае званне першакласных рашальнікаў, а Ірына Калачова ўпершыню выканала норму першага спартыўнага разраду па шашках. Норма ж другога разраду склала 29 ачкоў. Дадзеная публікацыя з'яўляецца падставай для прысвоення звяздоўскім канкурсантам адпаведных разрадаў.

Мы вельмі ўдзячныя чытачам за актыўны ўдзел у конкурсе рэспубліканскага значэння, а калектыву Пастаўскай лясной гаспадаркі (кіраўнік Анатоль Уладзіміравіч САПРОНЧЫК) — за прызы.

«Пастаўская вясна»-4

На Пастаўшчыне прайшоў і прэстыжны міжнародны турнір. І тут у яго правядзенні важкі ўклад унёс лесгас, а таксама мясцовыя прадпрымальнікі і райвыканкам. Перамаглі ў ім экс-чэмпіён свету Андрэй Валюк (Гродна) і чэмпіён Украіны Аляксандр Колін. Яны запісалі на свой рахунак па 16 ачкоў з 18 магчымых, але так іх раставіў каэфіцыент. У дзесятку прызёраў увайшлі мінскія майстры Уладзімір Беляеўскі, Віталь Варушыла, Андрэй Барышаў і Вадзім Лапін з Кіева (у іх актыве — па 12 ачкоў), кандыдат у майстры спорту Сяргей Бурко (Орша), майстры з Мінска Андрэй Маісееў, Дар'я Федаровіч і кандыдат у майстры з Пастаў Іван Троцкі (па 11). У жаночым заліку вызначаліся Дар'я і Вольга Федаровіч (па 11) і Настасся Стасючонак з Віцебска (8).

Пазнаёмцеся з фрагментам гульні:



БЕЛЫЯ (В. Марцінкевіч): a3, c3, d4, e1, e3, f2, g1, h6 (8). ЧОРНЫЯ (Ф. Маркевіч): a7, b6, c5, e5, f6, f8, g7, h4 (8). Белыя, прадстаўляючы шашыстаў з Глыбочыны, згулялі вельмі востра: 1. ef4 e:g3 2. cb4 3. f:d4 ba5 4. bc5 gh2 5. cd6, аднак чорныя знайшлі рэсурсы для выратавання, у чым пераканайцеся самі. Таксама будзем рады вашай вынаходлівасці.

Усміхнёмся!

— Марыначка, а ці не зайсці вам да мяне ў госці? Ёсць цэлая бутэлька «Марціні»!

— Выдатна! А што-небудзь яшчэ акрамя запівону ёсць? ☺

Жонка:

— Дарагі, дзе ты быў усю ноч?

Муж:

— На рыбалцы.

Жонка:

— Што-небудзь падчапіў?

Муж (здрыгануўшыся):

— Спадзяюся, не.

Сяргей МАСЛОЎСКІ:

«ПАТЭНЦЫЙНЫХ ПАРУШАЛЬНІКАЎ ЛЕПШ ЗАГАДЗЯ ВЫЯВІЦЬ І СПЫНІЦЬ, ЧЫМ ПОТЫМ ЛАВІЦЬ»

Спецыяльна для «Звязды»

Паведамленні аб дарожна-транспартных здарэннях на тэрыторыі Міншчыны нагадваюць зводкі з месца баявых дзеянняў. У тым сэнсе, што ў аўтамабільных авариях ледзь не кожны дзень гінуць і атрымліваюць цяжкія калецтвы людзі. Кроў на аўтамагістралях і прасёлкавых дарогах сталічнай вобласці ліецца часцей, чым у іншых рэгіёнах.

Аб тым, якія захады прымаюцца для выпраўлення сітуацыі, аглядальнік «Звязды» гутарыць з начальнікам упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі УУС Мінаблвыканкама Сяргеем МАСЛОЎСКІМ.

— Сяргей Віктаравіч, вы — чалавек новы не толькі ў ДАІ сталічнай вобласці, але і ў сістэме Дзяржаўтаінспекцыі ўвогуле. Пасля прызначэння на новую пасаду ў вас не ўзнікла адчування, што трапілі з агню ды ў полымя?

— Раней я служыў у крымінальным вышуку, узначальваў аператыўна-пошукавае падраздзяленне, быў камандзірам палка патрульна-паставой службы. Упраўленне Дзяржаўтаінспекцыі Мінскай вобласці ўзначаліў месяц таму. З таго часу спакой мне толькі сніцца. Сітуацыя на дарогах Міншчыны вельмі складаная. За 4 месяцы гэтага года ў цэнтральным рэгіёне ў выніку ДТЗ загінула на 32 чалавекі больш, чым за такі ж перыяд года мінулага. Усяго ж за гэты час не вярнуліся з дарог Міншчыны 139 чалавек. Колькасць параненых павялічылася на 69 чалавек і склала 411 грамадзян.

Безумоўна, можна наракаць на цэлы шэраг аб'ектыўных прычын, якія садзейнічаюць аварыйнасці. Гэта і само геаграфічнае становішча Міншчыны, праз якую праходзяць усе асноўныя магістралі, а значыць і велізарная плынь машын (ды і ў самой вобласці зарэгістравана амаль 400 тысяч транспартных сродкаў), і набліжанасць да сталічнага мегаполіса, дзе яшчэ большы аўтапарк, і мноства іншых фактараў. Аднак не ў маіх правілах шукаць адгаворкі і наракаць на лёс. Трэба тэрмінова выпраўляць становішча. Прамаруджванне — да смерці падобна. І не аднаго чалавека, а дзесяткаў людзей.

— З чаго пачалі аперацыю па выратаванню людзей на дарогах?

— З сябе.

— ?!

— Я ўзяў пад персанальны кантроль самы праблемны ў вобласці раён — Маладзечанскі. Толькі за мінулыя (перад нашай размовай. — **Аўт.**) суткі непасрэдна ў горадзе зарэгістравана 18 фактаў парушэння хуткаснага рэжыму, затрыманы 2 п'яныя вадзіцелі... А раней там увогуле на дарогах і вуліцах была амаль што поўная анархія. Давялося мяняць кіраўніка мясцовай Дзяржаўтаінспекцыі, сам часта наведваю гэты раён, сустракаюся не толькі з прадстаўнікамі ўлады, але і з простымі людзьмі, вадзіцелямі і пешаходамі. Гэта самы эфектыўны і дзейсны спосаб прафілактыкі аварыйнасці. Ужо з першых дзён сваёй службы на пасадзе кіраўніка ДАІ вобласці я запатрабаваў, каб падначаленыя праводзілі як мага больш індывідуальных прафілактычных размоў з удзельнікамі дарожнага руху. Асабліва пільная ўвага ўдзяляецца асобам, якія маюць схільнасць да парушэння ПДР. Мы стварылі своеасаблівы «банк звестак патэнцыйных парушальнікаў». У гэтым «чорным спісе», напрыклад, пазначаны вадзіцелі, якія затрымліваліся за кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане, уладальнікі незарэгістраваных матацыклаў. Менавіта з такімі асобамі і праводзім прафілактыку. Патэнцыйных парушальнікаў лепш загадзя выявіць і спыніць, чым потым лавіць. Гэта, між іншым, у інтарэсах іх жа бяспекі. Узяць, напрыклад, тых жа вясковых падлеткаў і маладых людзей, якія гойсаюць без правоў і без шлемаў на матацыклах. За 4 месяцы па віне пераважна такіх «дзікіх байкераў» на тэрыторыі вобласці адбылося 16 ДТЗ, у выніку якіх 2 чалавекі загінулі і 15 — атрымалі цялесныя пашкоджанні. Днямі здарыўся яшчэ адзін такі трагічны выпадак: адзін малады чалавек загінуў, другі трапіў у рэанімацыю. Увогуле, аварыйнасць па віне ўладальнікаў мотатранспарту ў вобласці ўзрасла ў 2 разы. Мы проста абавязаны ратаваць гэтых хлапчукоў!

— Якім чынам? На кожнай вясковай і тым больш лясной дарозе паставіце дзяжурыць «даішнікаў»?

— Не. У мяне няма такой магчымасці. Ды і немэтазгодна гэта. Куды больш эфектыўныя спецыяльныя рэйды, падчас якіх выяўляюцца ўладальнікі незарэгістраваных матацыклаў. Участковыя інспектары таксама штодзённа праводзяць карпатлівую працу па ўстанаўленню такіх «гора-байкераў». На сёння намі ўжо канфіскавана 127 матацыклаў, гаспадары якіх не мелі ніякіх дакументаў на транспартныя сродкі.

Зразумела, што аднымі карнымі мерамі вырашыць праблему немагчыма. Таму мы вырашылі накіраваць «стыхійнае байкерства» ў законнае рэчышча. Арганізавалі працу 24 мотагурткоў агульнай колькасцю 450 чалавек. Усім ахвотнікам прадастаўляем магчымасць у парадку самападрыхтоўкі здаць экзамены на атрыманне вадзіцельскага пасведчання катэгорыі «А», якое дае права кіраваць матацыклам. Сёлета такой магчымасцю скарысталіся больш за 250 чалавек.

Між іншым, у Пухавіцкім раёне менавіта ўдзельнікі мотагурткоў актыўна дапамагаюць Дзяржаўтаінспекцыі выяўляць асобаў, якія гойсаюць на незарэгістраваных матацыклах, без шлемаў, без правоў, у нецвярозым стане.

— Вы ўзгадалі праблему п'янства за рулём. З першага сакавіка дзейнічае новы Адміністрацыйны кодэкс, які прадугледжвае за такое правапарушэнне больш строгую адказнасць, у тым ліку і крымінальную. Наколькі гэты дакумент «выцверазіў» вадзіцеляў?

— На жаль, істотных зрухаў у лепшы бок не адбылося. Практычна кожнае дзесятае ДТЗ у вобласці адбываецца па віне п'яных вадзіцеляў. За 4 месяцы адбылося 42 такія аварыі, у якіх 13 чалавек загінулі і 42 — атрымалі раненні. Штодзень мы затрымліваем у сярэднім каля 50 нецвярозых вадзіцеляў. Сёлета ўжо выяўлена 7 фактаў паўторнага кіравання транспартным сродкам п'янымі асобамі. Двое з гэтых грамадзян ужо прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці, у адносінах астатніх вядзецца следства. З п'яніцамі мы змагаемся бескампрамісна, задзейнічаем усе сілы і сродкі, у тым ліку і масавай інфармацыі. У прыватнасці, усе раённыя газеты вобласці друкуюць спісы асобаў, якія былі затрыманы за кіраванне транспартам у нецвярозым стане.

— Падчас нядаўняй сустрэчы з журналістамі начальнік упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама Іван Сяргей паведаміў, што пасля ўступлення ў сілу новага Адміністрацыйнага кодэкса ўзніклі пэўныя цяжкасці з «дакументаваннем» п'яных вадзіцеляў. Патлумачце, калі ласка, больш падрабязна.

— Па сутнасці гэта адна, матэрыяльна-тэхнічная, праблема, звязаная з аснашчэннем сучасным абсталяваннем наркалагічных пунктаў. Зараз меру пакарання за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане вызначае толькі суд, які робіць свае высновы на падставе медыцынскага заключэння. Каб аформіць такі дакумент, інспектару ДАІ даводзіцца падчас везці нецвярозага вадзіцеля ў медустанову з неабходным абсталяваннем за некалькі дзесяткаў кіламетраў. Напрыклад, у Мінскім раёне да нядаўняга часу быў толькі адзін такі наркалагічны пункт у Сеніцы, днямі ў Заслаўі адкрылі другі. Стала крыху зручней. Але да канца праблема яшчэ не вырашана. Кіраўніцтва медустаноў і рада было б нам дапамагчы, але абсталяванне для падобных пунктаў каштуе немалых грошай.

— Яшчэ адна надзвычай востpая праблема: пешаходы, якія ўпарта не хочуць насіць у цёмны час сутак флікеры. Магчыма, варта ўжо прымяняць і прадугледжаныя законам меры пакарання за гэтае парушэнне?

— Згодзен, што надышоў час запусціць і «механізм прымусу». Наўрад ці — зараз камусьці невядома, што трэба абавязкова насіць флікер пры руху па праезнай частцы дарогі ў цемры. На тэрыторыі Мінскай вобласці арганізавана 1600 гандлёвых пунктаў, дзе можна набыць святлоадбівальныя элементы. За 4 месяцы прададзена амаль 100 тысяч адзінак такой прадукцыі. Да таго ж супрацоўнікі міліцыі самі сабралі 17 мільёнаў рублёў, за якія купілі 8,3 тысячы флікераў і распаўсюдзілі іх сярод жыхароў рэгіёна.

Увогуле, пешаходы — адна з асноўных груп рызыкі на дарозе. За 4 месяцы пад коламі транспартных сродкаў загінулі 65 чалавек, яшчэ 118 — атрымалі раненні. Усяго ж з удзелам пешаходаў адбылося 178 ДТЗ, што складае 42 працэнты ад агульнай колькасці аварый.

Намі прыняты шэраг неадкладных мераў па забеспячэнню бяспекі пешаходаў. У прыватнасці, быў праведзены дэталёвы аналіз усіх месцаў, дзе найчасцей здарыліся ДТЗ такога кшталту і створана своеасаблівая «дарожная карта». Яна ёсць зараз ва ўсіх начальнікаў мясцовых падраздзяленняў ДАІ. Для ліквідацыі наступстваў ва ўсіх «гарачых кропках» праводзяцца адпаведныя работы: дзесьці ставіцца мігаючы святлафор, наносяцца «шумавыя палосы», будуюцца агароджы, пешаходныя пераходы і г.д. І гэта дае станоўчыя вынікі.

— Сяргей Віктаравіч, а ўвогуле, ці існуе нейкі стратэгічны план па паляпшэнню сітуацыі на дарогах Міншчыны?

— Кіраўніцтва УУС Мінаблвыканкама, у тым ліку і Дзяржаўтаінспекцыі, сумесна з мясцовымі ўладамі распрацавала цэлую праграму па стабілізацыі абстаноўкі, прасцей кажучы, па выратаванню людзей. Але ніякія планы, нават самыя дасканалыя, грунтоўна прадуманыя і шчодра прафінансаваныя, не вырашаць праблему аварыйнасці. Без удзелу насельніцтва навесці належны парадак на дарогах немагчыма. Таму мы актыўна заклікаем да супрацоўніцтва ўсіх і кожнага: выконвайце самі Правілы дарожнага руху і не дазваляйце іншым іх ігнараваць, тэрмінова паведамляйце нам аб фактах парушэння ПДР па тэлефонах мабільнай сувязі: (8-029) 339-14-44, 509-42-44 ці 1О2, альбо па нумарах (8-017) 204-42-44, 229-04-44. Памятайце, толькі разам мы зможам зберагчы жыццё і здароўе ўдзельнікам дарожнага руху.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Ва ўрадзе

Капітал для інавацый

Сёлета ў эканоміку краіны плануецца прыцягнуць 11,2 мільярда долараў інвестыцый, падкрэсліў першы намеснік міністра эканомікі Пётр Жабко.

У першым квартале гэтага года толькі замежнымі партнёрамі ўкладзена ў рэспубліку 1,24 мільярда долараў інвестыцый. Прычым асноўная доля сродкаў пайшла ў прамысловасць, якая атрымала 554,7 мільёна долараў, або 45 працэнтаў замежных інвестыцый. Дастаткова спрыяльныя ўмовы для бізнэсу, якія краіна прапануе інвестарам, а гэта і ўстойлівы рост эканомікі, зніжэнне ўзроўню інфляцыі, наяўнасць развітой інфраструктуры і шмат іншае, падкрэсліваюць спецыялісты, за апошнія гады значна пашырылі кола дзелавых партнёраў па-за межамі Беларусі. Менавіта таму з года ў год і прасочваецца ўстойлівая тэндэнцыя росту замежных інвестыцый у рэспубліцы. Паводле даных Даклада ЮНКТАД аб сусветных інвестыцыях, наша краіна аднесена да групы дзяржаў з высокім патэнцыялам для прыцягнення замежных інвестыцый, аднак не поўнасцю яго выкарыстоўваючым. А па індэксу інвестыцыйнага патэнцыялу, які разлічаны на падставе 12 паказчыкаў, Беларусь паднялася з 65-га месца ў 2000 годзе на 50-е ў 2006 годзе сярод 141 краіны.

Падтрымліваюць падобнае меркаванне і замежныя спецыялісты, якія працуюць непасрэдна ў Беларусі. Так, паводле вынікаў праведзенага апытання, больш за палову замежных інвестараў ацанілі інвестыцыйны клімат, а таксама ўмовы ажыццяўлення інвестыцыйнай дзейнасці, як задавальняючыя, як добрыя — 17 працэнтаў рэспандэнтаў. Як адзначаюць у Мінэканомікі, аб прывабнасці інвестыцыйнага клімату ў Беларусі сведчыць таксама і тое, што ў рэспубліцы сфарміраваўся і паспяхова развіваецца сектар эканомікі, заснаваны на прыватных замежных інвестыцыях. У рэспубліцы працуе больш за 3,8 тысячы кампаній, арганізаваных з удзелам інвестараў амаль з 90 краін свету. А найбольшая колькасць сумесных і замежных прадпрыемстваў на тэрыторыі краіны створана з Расіяй — 1002, ЗША — 481, Германіяй — 360, Польшчай — 329, Літвой — 276, Злучаным Каралеўствам — 247, Латвіяй — 194.

Гаворачы пра замежны капітал, які прыходзіць у Беларусь, спецыялісты робяць акцэнт на тое, што зараз і ў будучым стаіць задача не проста ажыццяўляць гэтыя інвестыцыі ў абнаўленне вытворчых фондаў, але ажыццяўляць іх на падставе інавацыйнага развіцця галін эканомікі і рэспублікі ў цэлым. Гэта значыць, размова ідзе аб укараненні новых інавацыйных тэхналогій. У гэтых мэтах, паводле слоў Пятра Жабко, кіраўніком дзяржавы была зацверджана праграма інавацыйнага развіцця рэспублікі, якая павінна спрыяць павышэнню канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі на знешніх рынках. Да таго ж нам неабходна вырабляць у большай колькасці і, зразумела, якасны айчынны прадукт, каб не закупляць за мяжой тое, што ў стане зрабіць самі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Інфарм-укол

ЖАНЧЫНЫ НЕ ЗАЎСЁДЫ ВЫБІРАЮЦЬ БАГАТЫХ

Брытанскія вучоныя з універсітэта Сэнт-Эндрус прааналізавалі шматгадовыя вынікі апытанняў з нагоды крытэрыяў, па якіх жанчыны выбіраюць партнёраў. Аказалася, яны мяняюцца ў залежнасці ад стабільнасці іх уласнага эканамічнага становішча.

Калі жанчына фінансава незалежная, яна больш цэніць фізічную прывабнасць, а ў перыяд крызісу — уменне зарабляць грошы. І сапраўды, у жанчыне першапачаткова закладзена імкненне захоўваць ачаг і клапаціцца пра патомства. А як жа можна гэта зрабіць са слабым і бедным выбраннікам?

МОЦНЫ ГУК — ВОРАГ ВУШЭЙ

Высокі ўзровень шуму ў паўсядзённым жыцці можа прывесці да страты слыху. І галоўныя крыніцы небяспекі — MP3-плееры. Шматгадзіннае выкарыстанне плеераў пагражае пагаршэннем слыху.

Самая камфортная для вуха інтэнсіўнасць гуку — 40 дэцыбел. Гэта наша маўленне. А максімальна дапушчальны ўзровень гучнасці — 80 дэцыбел. Гэта мяжа дыскамфорту. Любы, больш моцны, гук прыводзіць да акустычнай траўмы і, як следства, да нейрасенсорнай тугавухасці. Яе можна заўважыць толькі пад мікраскопам, таму першыя сімптомы акустычнай траўмы — закладзеныя вушы і шум у вушах — часта пакідаюць без увагі.

КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск № 16 (548)

аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АББЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

■ Дом жылы ў г. Капылі, маецца газ, вада, тэлефон, сад, агарод.
Тэл. (8-01719) 55-869.

■ Дом драўляны 7х8, высокі, чысты вугал, на знос.
Тэл.: (8-0172) 74-53-62, 8-029-507-52-62.

■ Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, у райцэнтры Гарадок (у 2-павярховым цагляным доме), маецца балкон, тэлефон, гараж, нядорага, або абмяняю на Мінск, Віцебск. Магчыма даплата.
Тэл. 8-029-216-17-09.

■ Дом з г/п, калодзеж, сад у в. Забродзе Вілейскага раёна, або абмяняю на кватэру ў Мінску.
Тэл.: (8-01774) 73-337, 8-029-292-44-58.

■ Катэдж 2-павярховы з усімі выгодамі каля ракі Нёман, 40 км ад г. Ліды, 20 тыс. у.а.
Тэл. 885-71-59.

■ «Форд-фіеста», 1997 г.в., 1,3 л., «Аўдзі-80», 1981 г.в.
Тэл. 8-029-527-52-35.

■ «Вольва-945», 1991 г.в. 2,4 ТД, цёмна-зялёны перламутр, універсал, ц/з, сігналізацыя, музыка, стан добры.
Тэл. 8-029-639-67-50.

■ «Форд-сіера», 1989 г.в. 2,3 Д, універсал, цёмна-сіні, стан добры.
Тэл. 8-029-639-67-50.

■ Рухавік ГАЗ-52 II-кампл., кап. рамонт, 800 у.а., торг і з/ч да ГАЗа, кацёл-універсал на цвёрдым і газавым паліве, газавая калонка вытворчасці Ленінград, плуг і барана конныя.
Тэл. (8-01776) 50-711, увечары.

■ Касілка да міні-трактара, прычэп «Зубраня», сепаратар малака.
Тэл. у Мінскім раёне: 507-72-72.

■ Кабыла рабочая, узрост 8 гадоў.
Тэл. 501-52-86 (хатні).

■ Камбайн СК-5, прычэп ПТ-9.
Тэл. 8-029-706-29-38.

■ Гараж металічны 3,5х5,6 без месца, мапед «Карпаты», 1990 г.в.
Тэл. 8-029-757-20-16.

■ Трактар самаробны з дызельным рухавіком з прычэпам, культыватарам, плугам.
Тэл. 8-029-699-80-87.

■ Мабільны тэлефон «Нокіа 1600», добры стан, 75 у.а.
Тэл. (8-017) 276-18-74.

■ Газавая пліта «Гефест» (Брэст) ва ўпакоўцы.
Тэл. (8-017) 295-96-84.

■ Пчаласем'і з вуллямі і без, пасека 5 км ад Радашковічаў.
Тэл. 8-029-754-08-85.

КУПЛЮ

■ Трактар Т-16, магчыма ў нерабочым стане, разгледжу любыя прапановы
Тэл. 8-029-553-05-63.

■ Т-25 на з/ч у любым стане з дакументамі.
Тэл. 8-029-519-42-59.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, часопіс «Советское фото» № 4 за 1969 г.
Тэл. 8-029-850-17-29.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі

220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287-17-79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

_____

Подпіс_____ Дата_____

Дарагую нявестку **Раісу Віктараўну МІХАЙЛОЎСКУЮ** з г. Мінска віншую з днём нараджэння. Жадаю моцнага здароўя, даўгалецця і поспехаў ва ўсіх справах.

Свякроў, *в. Тачаўшчына.*

Згублены ваенны білет МК № 0425790 на імя Кастэнкі Дзмітрыя Васільевіча **лічыць несапраўдным**.

У суд г. Жодзіна Мінскай вобласці паступіла заява Мінскага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергетыкі «Мінскэнерга» аб прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна **САЧУКА Валянціна Пятровіча**, 1 верасня 1946 года нараджэння, ураджэнца в. Глінішча Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці, які раней пражываў у інтэрнаце Жодзінскай ЦЭЦ у п. 29 дома 11 па вул. Першамайскай у г. Жодзіна. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра В.П. Сачука, паведаміць іх суду г. Жодзіна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява ад Т.У. Ігнаткевіч аб прызнанні памерлым яе былога мужа **ІГНАТКЕВІЧА Яўгена Паўлавіча**, 22.01.1976 года нараджэння, ураджэнца горада Лунінца Брэсцкай вобласці, які пражываў па адрасу: г. Лунінец, вул. Сенная, д. 22. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Я.П. Ігнаткевіча, паведаміць іх суду Лунінецкага раёна (г. Лунінец, вул. Фрунзе, 12) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

В суд Дрогичинского района Брестской области поступило заявление о признании умершими **ШОСТАКА Павла Павловича, ШОСТАК Евдокии Тимофеевны, ШОСТАК Марии Павловны, ШОСТАКА Николая Павловича, СКШИДЛО Иосифа, БОНДАРУКА Федора Артемовича**.

Родной дядя Левкович Павлины Демьяновны — Шостак Павел Павлович, родившийся в деревне Ямник Дрогичинского района Брестской области 01.03.1890 года, состоял в браке с Левкович Евдокией Тимофеевной, которая после заключения брака была известна по фамилии Шостак. У них в деревне Ямник Дрогичинского района родилось 6 детей: Шостак Анна Павловна, родившаяся 24.10.1923 года; Шостак Петр Павлович, родившийся 05.02.1925 года; Шостак Мария Павловна, родившаяся 01.11.1927 года; Шостак Николай Павлович, родившийся 20.05.1929 года; Шостак Валентина Павловна, родившаяся 20.03.1931 года; Шостак Татьяна Павловна, родившаяся 03.01.1933 года.

Имеются сведения, что Шостак Павел Павлович, его жена Шостак Евдокия Тимофеевна и их 4 детей — Шостак Мария Павловна, Шостак Валентина Павловна, Шостак Николай Павлович и Шостак Петр Павлович — были расстреляны немецкими оккупантами в 1943 году в деревне Ямник Дрогичинского района Брестской области (Республика Беларусь). Вместе с ними был расстрелян и Скшидло Иосиф, муж Скшидло Ульяны Павловны, известный также как Скшидло Юлия Павловна. Она состояла в двух браках: первый брак был заключен с Бондаруком Артемом в 1908 году, после заключения брака она была известна по фамилии Бондарук. Ее муж Бондарук Артем умер в 1930 году. У них был только один сын — Бондарук Федор Артемович. В 1939 году Бондарук Ульяна Павловна вступила во второй брак с гражданином Скшидло Иосифом и приняла фамилию мужа Скшидло. Ее сын Бондарук Федор Артемович, родившийся в деревне Великий Лес Дрогичинского района Брестской области, был призван в ряды Советской Армии и погиб на фронте в 1944 году в Латвии.

Просим всех, кому что-либо известно о месте нахождения указанных лиц либо обстоятельствах их смерти и месте захоронений, сообщить об этом в суд Дрогичинского района Брестской области.

Весткі з месцаў

З настальгіяй па сапраўднаму

Некалі, падчас адкрыцця летняй танцпляцоўкі, іграў наш духавы аркестр. Пад яго чароўныя мелодыі ахвотна танцавалі сталыя, а вось падлеткі, якія нахапаліся папулярных гукаў электрагітар, кідалі ім пад ногі капейкі, тым самым гаворачы: ваш час мінуў. Думалася: няўжо і праўда?

Прайшла чвэрць веку, а яны, духавыя і народныя інструменты, па-ранейшаму гучаць на вялікіх і малых сцэнах, у музычных каледжах і спецыялізаваных школах. Не выключэнне і Жабінкаўская школа мастацтваў. Каб пазнаць таемны свет музыкі, сюды прыходзяць не толькі гарадскія дзеці, але і вясковыя, нават з суседніх раёнаў. І дапамагаюць ім вопытныя педагогі. На рахунку Мікалая Васільевіча Зіноўева, напрыклад, не адна сотня выпускнікоў. У Жабінцы ён пачынаў мастацкім кіраўніком раённага Дома культуры і сувязь з ім трымае дасюль. Ужо больш за дзесяць гадоў кіруе народным вакальным ансамблем. «Каларыт» пабываў у Польшчы, стаў лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Беларусь — мая песня», мае дыпломы шматлікіх міжнародных конкурсаў.

...Аднойчы Мікалай Васільевіч сыграў танга «Пырскі шампанскага». Сыграў на баяне. А так хацелася б пачуць яго ў выкананні духавога аркестра.

Аляксей ГАНЧУК.
Фота аўтара.

Паважаныя сябры!

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Гродзенскі аблвыканкам, Карэліцкі райвыканкам, Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга зноў запрашаюць на V рэгіянальны фестываль мастацтваў «Мірскі замак-2007», які адбудзецца 2—3 чэрвеня ля муроў Мірскага замка.

Сёлетні фестываль у Міры, што месціцца ў сэрцы Гродзеншчыны, закліканы прыцягнуць увагу да музычных скарбаў Гродзенскага краю, якія назапашваліся на працягу многіх стагоддзяў і прадстаўленыя не толькі багацейшым фальклорам, але і прафесійным музычным мастацтвам.

Феерычныя канцэрты ў залах і на пленэры, з уласцівым для іх высокім напалам, спалучаюцца з інтэлектуальнай засяроджанасцю навуковай канферэнцыі, а святкаванне 125-годдзя славутых песняроў беларускай зямлі Янкі Купалы і Якуба Коласа — з «музычным падарункам» былым мецэнатам Мірскай зямлі — Радзівілам, і нарэшце — з джазавым канцэртам.

Вы адчуеце незвычайную асалоду ад прэм'еры новай праграмы камерных калектываў Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі «Знакамітыя імёны Беларусі» Мацей Радзівіл (1751—1821), Антоній Радзівіл (1775—1833), унікальнага канцэрта «Дыялог супрацьлегласцяў-2» з удзелам біг-бэнда Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі і Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча. Адметная старонка фестывалю — гала-канцэрт калектываў і выканаўцаў Гродзенскай абласной філармоніі «Песняры беларускай душы». У першы дзень мастацкія калектывы Карэліцкага раёна пакажуць сваё майстэрства ў пасялковым амфітэатры. Назаўтра традыцыйныя для рэгіёна песні і танцы перабяруцца бліжэй да замка, каб арганічна ўпісацца ў сярэдневяковы турнір і горад майстроў.

Мірскія навуковыя чытанні «Архітэктурная спадчына Беларусі — канстанта памяці» дапамогуць адчуць подых старажытнага дойлідства.

Сучасны пасёлак сустрэне вас фотавыстаўкай народнага фотаклуба «Гродна» «Мірскі замак — крыніца натхнення», шматлікімі атракцыёнамі.

Пачатак у 11:00.

Запрашаем вас на свята!

Арганізацыйны камітэт.

БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФОНД: ДЗЕЦЯМ — СВЯТА, ДАРОСЛЫМ — ПАШАНА

З 28 мая па 1 чэрвеня ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭКСПА» ў Мінску праходзіць 10-я дабрачынная акцыя «Падорым дзецям свята», у межах якой на выстаўцы дзіцячай творчасці будуць прадстаўлены работы дзяцей-сірот з сямейных дзіцячых дамоў г. Бабруйска, дамоў творчасці дзяцей і моладзі, школ мастацтваў, сталічных цэнтраў пазашкольнай работы, а таксама работы дзяцей-сірот і дзяцей-інвалідаў з розных рэгіёнаў.

Дні акцыі будуць насіць тэматычны характар: Дзень прэзентацыі дзіцячай прэсы, Дзень інтэрнацыянальнай дружбы дзяцей, Феерверк дзіцячай творчасці і г.д. У дабрачынных канцэртах возьмуць удзел творчыя студыі, харэаграфічныя калектывы і зоркі беларускай эстрады. Гледачы пабачаць вясёлыя танцы, выступленні клоунаў, стануць удзельнікамі гульняў і конкурсаў.

1 чэрвеня Беларускі дзіцячы фонд традыцыйна ўручыць ганаровыя прэміі «Сябар дзяцей» і імя Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі. Першай прэміі ўдастойваюцца людзі, якія служаць міласэрнасці і дапамагаюць усім, хто мае ў гэтым патрэбу. Лаўрэатамі прэміі імя З. Тусналобавай-Марчанкі па традыцыі становяцца тры шматдзетныя сям'і, у якіх выхоўваецца пяць і болей дзяцей, і дзе развіваюцца творчыя, інтэлектуальныя здольнасці кожнага.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Праверце, калі ласка, адказы

Сканворд (19 мая). **Па гарызанталі:** «Дынама». Голас. Тарыф. Тау. Перл. Узда. Юнак. Барс. Фама. Безэ. Катафот. Ра. Арфа. Рапс. Ілька. Рулет. Бужаніна. Рыс. Донар. Бат. Увага. Капітан. Рынг. Пісар. Аловак. **Па вертыкалі:** Калумб. Мікраскоп. Слуп. «Абэрак». Віра. Араб. Батыр. Аўтапарк. Ураган. Сава. Танга. Рад. Люфа. Руно. Люфт. Нафталін. Адамо. Пена. Сулу. Кат. Старынік.

Сяргей БУБКА:

«Я ЗДЗІЎЛЕНЫ, ШТО МОЙ РЭКОРД НІХТО НЕ ПАЎТАРЫЎ»

П'едэстал

Былы прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Хуан Антоніо Самаранч назваў гэтага ўкраінскага атлета самым выдатным спартсменам сучаснасці. І напэўна меў рацыю. Сяргей Бубка — пераможца Алімпіяды ў Сеўле-1988, дзесяціразовы чэмпіён свету (шэсць разоў на адкрытых стадыёнах і чатыры разы ў зачыненых памяшканнях), уладальнік 35 рэкордаў планеты. Яго найвышэйшыя спартыўныя вынікі ў скачках з шастом — 6 метраў 14 сантыметраў на адкрытым стадыёне (1994 год) і 6 метраў 15 сантыметраў у зале (1993) — пакуль ніхто так і не здолеў паўтарыць. Тройчы прызнаваўся лепшым спартсменам свету. З чэрвеня 2005 года з'яўляецца прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта Украіны. На мінулым тыдні Сяргей Назаравіч у складзе спартыўнай дэлегацыі Украіны наведаў Беларусь. Зразумела, нельга было не выкарыстаць гэты візіт, каб пагутарыць з «зоркай» сусветнага спорту, а таксама членам выканкама Міжнароднага алімпійскага камітэта, старшынёй камісіі спартсменаў МАК, членам Савета міжнароднай асацыяцыі легкаатлетычных федэрацый і проста чалавекам, які вельмі адданы спорту.

— Першае пытанне напрошваецца само сабой: як лічыце, чаму вашыя рэкорды ў свеце дагэтуль не пабіты?

— Шчыра кажучы, гэта пытанне мяне ўжо пачынае стамляць, бо многія журналісты цікавяцца маім меркаваннем на гэты конт. Я здзіўлены, што сучасныя атлеты не могуць наблізіцца да маіх дасягненняў, бо мой настаўнік, заслужаны трэнер СССР Віталь Пятроў, быў перакананы, што вышыню 6 метраў здольны ўзяць кожны высокакласны шасцівік (у 42 спаборніцтвах Бубка ўзяў вышыню 6 метраў і вышэй — **Аўт.**).

— Значыць, сярод сучасных спартсменаў вы не бачыце таго, хто можа ўзяць гэту планку?

— На жаль, шасціметровы рубеж для сучасных легкаатлетаў з'яўляецца цяжкапраходным. Вельмі крыўдна гэта казаць, але ж скачкі з шастом зараз знаходзяцца ў застоі. Аднак я ўпэўнены: рана ці позна мае рэкорды нехта паб'е, бо ў час майго выступлення, я адчуваў, што рэальна можна скочыць яшчэ вышэй.

— Калі вы апошні раз скакалі з шастом?

— Пасля Сіднея не браў ужо шэст у рукі, бо хачу захаваць тыя пачуцці, якія засталіся ў мяне пасля сур'ёзных скачкоў.

— У вас шмат абавязкаў. Ці знаходзіце час кансультаваць спартсменаў?

— Так, хоць з маім графікам гэта зрабіць цяжка. З ахвотай дзялюся сваім вопытам, расказваю аб методыцы і тэхніцы скачкоў з шастом на семінарах.

— За ўстанаўленне сусветных рэкордаў прадугледжана ўзнагароджанне (за апошні поспех у 1994 годзе Бубка атрымаў «Ферары»). Як вы ставіцеся да такой камерцыялізацыі спорту?

— Я гэта расцэньваю як кампенсацыю за цяжкую працу атлетаў на працягу многіх гадоў. Гэта нармальна, калі людзей, якія паказваюць фенаменальныя вынікі (іх адзінкі ў свеце), ацэньваюць. Тады яны адчуваць сябе абароненымі і пасля завяршэння спартыўнай кар'еры. Аднак я перакананы, што мы павінны стварацъ умовы не толькі для рэкардсменаў, але і для ўсіх атлетаў, каб яны маглі знайсці сябе пасля завяршэння кар'еры, бо многа аддалі, каб праславіць сваю краіну.

— Днямі Беларусь і Украіна падпісалі праграму аб супрацоўніцтве ў сферы фізічнай культуры і спорту. Ці варта дапамагаць сваім саперникам на спартыўнай арэне?

— Сёння канкурэнцыя ў спорце вышэйшых дасягненняў расце з кожным днём. На арэне нашы атлеты спаборнічаюць за медалі, але па-за ёй з'яўляюцца сябрамі і аднадумцамі. Я лічу, што той вопыт, які маюць наша і ваша краіны, дапаможа захаваць лепшыя традыцыі ва ўкраінскім і беларускім спорце і палепшыць узровень спартсменаў абедзвюх краін.

P.S. У Нацыянальным алімпійскім камітэце РБ Сяргей Бубка быў узнагароджаны беларускім Алімпійскім ордэнам.

Ірына ПРЫМАК.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.48	21.27	16.39
Віцебск —	4.30	21.24	16.54
Магілёў —	4.38	21.17	16.39
Гомель —	4.43	21.05	16.22
Гродна —	5.05	21.40	16.35
Брэст —	5.14	21.32	16.18

Імяніны

Пр. *Музы, Аляксандра, Георгія, Касьяна, Лаўрэнція, Фёдара, Яфрэма.*

К. *Магдалены, Марыі, Тэадозіі, Уршулі, Аляксандра, Максіміляна, Пятра, Тодара .*

Месяц

Поўня 1 чэрвеня

Месяц у сузор'і Скарпіёна

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 29.05.2007

Экстрэмальны ..... 11+
Вельмі высокі ..... 8—10
Высокі ..... 6—7
Умераны ..... 3—5
Нізкі ..... 1—2

Для бязвоблачнага неба: UV INDEX 5,9

З улікам прагназуемай воблачнасці: UV INDEX 5,3

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **20 мінут**.

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+22 — +24 °C	МАСКВА	+30 — +32 °C, Без ападкаў
ВІЛЬНЮС	+26 — +28 °C	РЫГА	+26 — +28 °C, Без ападкаў
КІЕЎ	+25 — +27 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+19 — +21 °C

Тэлесеткі

Спяюць 22 «зоркі»

Праект АНТ «Дзве зоркі» хоць і скончыўся, але не развітаўся з гледачамі. Наадварот, удзельнікі — «зорныя» дуэты — зробяць крок з тэлеэкранаў на галоўную сцэну краіны. 31 мая ў Палацы Рэспублікі адбудзецца гала-канцэрт праекта, дзе і можна будзе зрабіць выснову, каго з удзельнікаў «тэлекарцінка» псавала, а каму, наадварот, дапамагала.

Выступленне двух з 13 дуэтаў было пад пагрозай зрыву — Алеся Мухіна і Анатоля Ярмоленкі не будзе ў дзень канцэрта ў Мінску. Але выйсце знайшлося: у пары з Вікторыяй Алешка спяе тэлевядучы Яўген Лашкоўскі, які ўвесь праект крытыкаваў «зорак» з-за барнай стойкі. А Вольга Сярожнікава выканае песню «Пазвані мне, пазвані...» адна, але Анатоль Ярмоленка падтрымае яе... якраз па тэлефону.

Сярод выступоўцаў на гала-канцэрце гледачы не далічацца двух дуэтаў: народнага артыста Беларусі Мікалая Скорыкава і дырэктара Белдзяржцырка Таццяны Бандарчук, а таксама саліста Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі Дзмітрыя Качароўскага і фітнес-трэнера Наталлі Наважылавай. Гэтыя пары адмовіліся ад выступленняў, спаслаўшыся на вялікую занятасць. Затое колькасць спяваючых тэлевядучых папоўніцца парай Яўген Лашкоўскі—Таццяна Рудакоўская (яны выканаюць фінальную песню). На працягу шоў «Дзве зоркі» яны асвойвалі прафесіі бармэна і афіцыянткі, а зараз выпрабуюць на сабе, ці лёгка гэта — спяваць перад публікай. Зрэшты, Таццяну прафесіяналы хваляць: пасля заняткаў па вакалу кампазітар і аранжыроўшчык Дзмітрый Далгалёў параўнаў дыяпазон яе голасу з дыяпазонам самой Алы Пугачовай...

Суправаджаць выступленні ўдзельнікаў у канцэртнай праграме будзе Прэзідэнцкі аркестр пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна.

У сярэдзіне чэрвеня тэлеверсія канцэрта будзе паказана на канале АНТ.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

29 мая

Дзве даты

1522 год — 455 гадоў таму з'явіліся першыя звесткі пра мястэчка Лагішын (Пінскі павет Брэсцкага ваяводства). У 1643 годзе Лагішын атрымаў магдэбургскае права, якім карыстаўся да 1795 года, і герб з выявай ваўка на ласіных нагах. У XVII стагоддзі Лагішынскі старастат лічыўся адным з найбагацейшых у ВКЛ і разам з горадам належаў роду князёў Радзівілаў (пазней Агінскім і Любецкім).

1802 год — рускі фізік Васіль Пятроў першым у свеце адкрыў з'яву электрычнай дугі (з дапамогай створанай ім буйнейшай для таго часу гальванічнай батарэі) і ўказаў на магчымасць яе практычнага прымянення. В. Пятроў, акрамя таго, даследаваў хімічныя ўласцівасці току, электраправаднасць, люмінесцэнцыю.

Цытата дня:

«Жыццё пазнаецца з кніг і твораў мастацтваў, можа быць, яшчэ ў большай ступені, чым з самога жыцця».

Тэадор Драйзер (1871—1945), амерыканскі пісьменнік.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Вадалеям пара ў адпачынак, а Цяльцам — набываць веды



АВЕН. Планы і задумы, хутчэй за ўсё, рэалізуюцца і прынясуць вам удачу. Можа спрыяльна развівацца і кар'ернае пытанне. Дзелавым партнёрам пажадана прадаставіць неабходны мінімум інфармацыі, які зможа заінтрыгаваць іх. Вы ад гэтага толькі выйграеце. Пажадана не захапляцца вялікімі шумнымі кампаніямі, бо менавіта там вас можа падпільноўваць падман і расчараванне. Пастарайцеся ў меру балаваць дзяцей — інакш ім будзе цяжка вярнуцца да парадку і правілаў, устаноўленых вамі. Нядзелю пажадана прысвяціць адпачынку.

ЦЯЛЕЦ. Вас чакаюць удалыя сустрэчы і зносіны з важнымі людзьмі. Могуць палепшыцца адносіны з дзецьмі і суседзямі. Настаў час, які падыходзіць для набыцця ведаў, прычым у любой галіне — ад кулінарыі да эзатэрыкі. Сутыкненне з бюракратамі і папяровая валакіта ў аўторак могуць зацягнуцца. Дапамога сяброў у чацвер будзе вельмі своечасовай. У пятніцу бытавая тэхніка можа прыпаднесці не вельмі прыемныя сюрпрызы. У нядзелю памятайце, што прыгоды бываюць небяспечнымі.

БЛІЗНЯТЫ. Варта стрымліваць жаданне яхідна каментаваць усякую падзею. Вашу з'едлівасць запомняць надоўга, і ў патрэбны момант можаце апынуцца без падтрымкі толькі таму, што мелі неасцярожнасць ляпнуць нешта крыўднае. У аўторак удалымі будуць дзелавыя сустрэчы. Ваша задача — зрабіць на партнёрай добрае ўражанне. У чацвер вас чакае выпрабаванне: будуць правяраць на ўменне захоўваць тайны. У нядзелю душа папросіць спакою і адзіноты. Устройце сабе перадышку — гэта спрыяльна адаб'ецца на вашым здароўі.

РАК. Цудоўны час, калі вы можаце ствараць сваю будучыню. Будзеце заўважаць цікавыя дэталі, сітуацыі, міма якіх раней праходзілі. У аўторак пастарайцеся падрабязна зафіксаваць цудоўную ідэю, якая наведае вас. У пятніцу, адстойваючы свой адзіна правільны пункт погляду, не будзьце такімі ўпартымі. Прыслухайцеся да слоў апанента, пачарпніце ў іх штосьці незвычайнае — і вы зможаце пазбегнуць канфліктнай сітуацыі. У суботу давядзецца прымаць адказныя рашэнні. А нядзелю лепш прысвяціць каротказасовым паездкам.

ЛЕЎ. Не варта губляць вельмі шмат часу на будаванне паветраных замкаў. Занятак прыемны, але чым больш прывабныя пабудовы, тым большае расчараванне ад жорсткай рэчаіснасці. Значна больш карысна паклапаціцца аб зямным. Прычым можна выкарыстоўваць самыя розныя метады, у тым ліку і інтрыгі. Галоўнае — увага да дробязяў і стараннасць у абдумванні дзеянняў. Пажадана не паказваць калегам па рабоце сваёй нецярпімасці, інакш усе справы могуць пайсці наперакос. Узрастае ваш аўтарытэт і ўплыў на навакольных. У гэты дзень усе пачынанні будуць паспяховымі. У другой палове тыдня вам могуць даручыць складаную і адказную работу — вы з ёй справіцеся.

ДЗЕВА. Тыдзень прынясе творчае натхненне. Адчуеце прыліў энергіі, практычна ўсе задумы будуць удавацца. Неабходна ўзяцца за рашэнне праблем, якія наспелі. У аўторак сканцэнтруйцеся на галоўным, а другарадныя справы пакуль крыху пачакаюць. Сваю імклівасць і ваяўнічасць лепш прытрымаць да чацвярга, хоць, на першы погляд, яна можа надаваць вам асаблівы шарм. У чацвер, па магчымасці, скараціце працоўны дзень да мінімуму. Інтуіцыя падкажа, як лепш закончыць гэты дзень, напоўнены містыкай і адчуваннем абнаўлення. Задумайцеся пра новыя дасягненні і планы на бліжэйшую і далёкую будучыню, бо многае ў вашых руках. У выхадныя пастарайцеся адпачыць ад хатніх клопатаў.

ШАЛІ. Вы не павінны губляць спрыяльных шанцаў, якія падорыць вам лёс. Усё будзе атрымлівацца лёгка, як бы само сабой. У першай палове тыдня задавальненне прынясе нават руцінная частка працы. А ўжо пра дзейнасць асэнсаваную і гаварыць няма чаго: важныя кантакты, перамовы і паездкі парадуюць станоўчымі вынікамі. Толькі звярніце пільную ўвагу на новых партнёраў: не выключана, што сярод іх можа знаходзіцца тайны нядобразычліўца. У другой палове тыдня пастарайцеся больш увагі надзяліць індывідуальнай творчасці.

СКАРПІЁН. Настае спрыяльны перыяд для планавання і абдумвання будучых спраў. Пастарайцеся не рабіць з мухі слана і пазбягайце бурных перажыванняў. На працы, хутчэй за ўсё, давядзецца актыўна дзейнічаць нягледзячы ні на што — нават на тое, што вашы дзеянні парушаць парадак, які склаўся. У сераду навакольныя людзі будуць настроены да вас па-добраму і падтрымаюць многія вашы ідэі. Усе справы і пытанні, звязаныя з тайнай інфармацыяй і сакрэтамі, пастарайцеся завяршыць да суботы. Калі ў суботу вам захочацца адасаблення, правядзіце гэты дзень у прагулках на свежым паветры.

СТРАЛЕЦ. Атрымаеце шанц ва ўсёй красе праявіць свае здольнасці, паказаўшы сябе з лепшага боку. Гэта можа завяваць заступнікаў. Пачніце ажыццяўленне задуманага — не выключана, што вы набліжаецеся да поспеху. Ёсць шанц, што дзякуючы клопатам сяброў вы пяройдзеце на больш прэстыжную і высокааплатную работу. Серада — удалы дзень для заключэння новага дзелавога пагаднення, набыцця надзейных партнёраў. У пятніцу пастарайцеся не перакладваць свае праблемы на чужыя, а таксама і родныя плечы: вырашыць іх гэта перамяшчэнне не дапаможа — насупраць, яны вернуцца ў больш ускладненым выглядзе. У суботу адпачніце, забудзьцеся пра цяжкасці жыцця, зменлівасці лёсу і сумныя думкі.

КАЗЯРОГ. Настае час рашучых дзеянняў. Чакаецца цудоўны, яркі, насычаны тыдзень. У вас будзе практычна ўсё атрымлівацца. Дойдзе да таго, што ў аўторак дзелавыя партнёры могуць скарыстацца вашай эмацыянальнасцю ў сваіх мэтах. А вашы ініцыятывы — сустрэць сур'ёзнае супраціўленне з боку начальства. Неабходна абавязкова завяршыць некаторыя з вельмі важных спраў. Сярэдзіна тыдня абяцае быць спрыяльнай для паездак. Калі прысвяціце тыдзень адпачынку, то многія з ідэй, на якія ніколі не хапала часу, могуць нарэшце ажыццявіцца. У суботу лепш не пачынаць новых спраў. У нядзелю пастарайцеся дапамагчы ўсім, хто звярнуўся па дапамогу.

ВАДАЛЕЙ. Можа з'явіцца столькі розных захапленняў, што дома вы станеце рэдкім госцем. Добры тыдзень для творчых пачынанняў, фізічнай актыўнасці і адстойвання асабістых інтарэсаў. Адна з галоўных мэтаў тыдня — умацаванне свайго становішча ў галіне дзейнасці, якая склалася. Пачынаючы з другой паловы тыдня настае спрыяльны час для адпачынку. Калі ж гэтага вам пакуль не свеціць, устройце хоць бы вечарынку для калег па працы — таксама забава.

РЫБЫ. Асабліва важна адчуць сваю незалежнасць. Гэта дапаможа раскрыць творчы патэнцыял і прадэманстраваць неабмежаваныя магчымасці навакольным. Будзе шмат спрэчак і дыскусій. Пастарайцеся не перакрыкваць апанента, а выслухаць яго і ветліва адказаць, карыстаючыся дакладнымі аргументамі. Па-першае, гэта зробіць большае ўражанне, а па-другое, у вас з'явіцца шанц пачуць што-небудзь цікавае. Магчыма, вы зменіце сваё меркаванне па нейкаму пытанню. У пачатку тыдня можаце смела разлічваць на дапамогу блізкіх, а ў канцы — лепш спадзявацца толькі на асабістыя сілы.

АЛЁ, НАРОД НА ПРАВАДЗЕ!

АБО ВЯСЁЛЫЯ І ПРАЎДЗІВЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Замест прадмовы. *Было гэта гадоў 20 назад, тады, калі толькі згледзеўшы чаргу, людзі ў яе станавіліся, часам — нават не пытаючы, што даюць. Якая розніца,* ***што****, калі патрэбна літаральна ўсё (не сабе, дык дзецям, ці — бацькам...). І грошы ёсць.*

А яшчэ — у чэргі запісваліся... Іх займалі з вечара. У іх — хадзілі адзначацца. Там жа — знаёміліся, сустракалі святы, і — здаралася — нават паміралі...

Ды, цяпер не пра тое. Неяк, перад Калядамі, яйкі з продажу зніклі — наогул. А потым — з'явіліся. Чарга наляцела — ці не з вярсту... Мужыку аднаму падфарціла: тры дзесяткі схапіў (больш не давалі...). І нясе. Асцярожна так, бо дэфіцыт. І яйкі. І поўны пакет. І галалёдзіца...

Баба за ім... Яна, кажуць, з печы ляціць сем дум перадумае, а тут — ідзе. І памалу. Ад зайздрасці аж сэрца кроіцца: «Во пашчасціла... І, мусіць жа, нейкай лахудры? Такі мужык — здабытчык! Не тое, што мой... Гэты, бач, і час знайшоў, і дастаяўся, і купіў! Сям'я з пірагамі на свята будзе, з салатамі... Хоць бы данёс толькі...».

Мужык, між тым, за вугал звярнуў, з поля зроку знік. А калі з'явіўся, у бабы — сэрца ў пяткі: схіл там і нічым не пасыпаны. Вось ён ступіў і... з капытоў. Аж зямля задрыжэла.

Баба да яго:

— Ай-я-яй, мужчина! Вы упали-таки?! А как же ваши яйца?

Той пачырваněў, буркнуў:

— Нармальна.

І ўстае. Лёгенька. Кабета толькі тут згледзела, што ў яго рукі пустыя — няма пакета. І не было. Не той мужчына. Той, з яйкамі, наперадзе. Як ішоў так і ідзе...

Слоўка падвяло.

Ды ці толькі яе? Знаёмая ў Польшчу ў госці паехала. Раніцай устала, гаспадар запрашае кудысь (па-свойму). Яна адно слова «разумее» — канапа.

Пакрыўдзіцца хацела... Пакуль не дайшло, што ён яе на каву кліча — з бутэрбродамі.

А яшчэ ў адной знаёмай — гаспадарка кулацкая. Неяк я тэлефанавала ёй: распытала, як кароўкі перазімавалі, як свінкі, куры, як трусы?

Свааяк (рускоговорящий) пры гэтым з пакоя паішоў...

І яшчэ. Пра тую ж «кулачку». На вельмі сур'ёзнай нарадзе, яна сярод іншых рашыла балючае пытанне ўзняць. Сказала:

— Як гэта так, каб чалавек скалечыўся, і нідзе не мог мыліц знайсці!

Увесь прэзідыум пры гэтым насамі закруціў: «Это же надо: какой мелочный народ пошёл... Нашли о чём говорить: видите ли, мыльниц нету».

То нагадаем (тым, хто забыўся), што трусы гэта кролики, а мыліцы — костыли. З іх сёння і пачнём.

Асноўны інстынкт

Я даўно заўважыў, што мае мыліцы найбольш цікавяць дзяцей і сабак. З першымі, як быццам, усё зразумела, а вось з другімі...

Іду аднойчы ў бок прыпынку — ціхенька, роўненька — нікога не чапаю, а ён — вялізазны, калматы, рыжы — насустрач. Сцежку мне загарадзіў і брэша. Ды так...

— Э, чый сабака? — пытаю ў людзей. — Забярыце!

— А нічый, — нехта кажа. — Дварняк, на будоўлі жыве, ля рабочых жывіцца.

— Бедны ты, харошы, — спрабую ўгаворваць я.

Рыжы вухам не вядзе, яшчэ болей брэша, — я кроку ступіць не магу...

Мужчына нейкі міма праходзіў. Як «гаўкне» на яго:

— Вон пашоў! Ах ты паскуда!

Сабака хвост падціснуў і ходу.

А я, пакуль да прыпынку дайшоў, другога рыжыка ўспомніў.

У маладосці калісь (якія там мыліцы!) мы такога ж дварнячка ля палітэхнічнага ўбачылі. Галодны быў, паглядзеў на нас такімі вачамі, што сябрук адразу ж палез у сумку, дастаў адтуль колца кілбасы, што сабе на вячэру купіў, кавалачак кінуў, потым другі... Сабака іх, як мух лавіў. І ўжо так удзячна глядзеў, так радасна махаў нам хвастом, што сябра... здаўся. Сказаў:

— Добры сабака, забяру дамоў.

Паклікалі. Рыжык пайшоў — спакойна, паважліва, як любы добры сабака ля ног не любога, а менавіта добрага гаспадара.

І мы ўжо з ім амаль дабраліся: да дома, дзе сябрук жыве, пару кварталаў якіх засталося. І тут наш рыжык... як дасца ўбок. Мы аж сталі ад нечаканасці, паглядзелі ўслед: за колькі дамоў ад нас маячыў невялічкі прывабны цень. Таксама з хвастом.

— Супраць асноўнага інстынкту не папрэш, — сумна зазначыў мой сябар, хаваючы рэшткі каўбасы.

А я з той пары чамусьці стаў паважаць рыжых катоў, рыжых сабак. І рыжых кабет.

Ілля ШАХРАЙ,

г. Мінск

Прасцей трэба быць

Сваё саракагоддзе мая сяброўка адзначала ў вёсцы, у свякрыві. Запрасіла і мяне. А каб я не блудзіла, каб не блыталася па нейкіх аўтобусах-электрычках, сказала:

— Мой начальнік і яшчэ двое мужчын на машыне будуць ехаць. Месца там ёсць. То яны і цябе падбяруць.

Хто б быў супраць?!

У прызначаны дзень з ранку я стаяла на кухні, гатавала... Ну чаму б не салату, калі ў мяне гэта выходзіць лепш, чым нейкі там торт?

Карацей, у прызначаны час, з ёй, гатовай, вялікай, прыгожа запакаванай, я выйшла на вуліцу, села ў машыну. Цікавыя там былі людзі, толькі нейкія дужа надзьмутыя, важныя.

А зрэшты, мне з імі што — дзяцей хрысціць? Не... Не гаворыце вы, і я памаўчу. Едзем.

За горад выехалі, у лес і... сталі, колам — у машыне зламалася нешта. Мужчыны адкрылі капот, сталі калупацца пад ім, нешта правіць. Паўгадзіны, гадзіна. З аднаго боку — нервы гараць, спазняемся. А з другога — май на дварэ! Лістота чыстая-чыстая, трава зялёная-зялёная, птушкі пяюць — аж лес разлягаецца! А ўжо паветра, кветкі...

Скінула басаножкі, прайшлася, назбірала кветак. Пасядзела пад дрэвам.

Тыя мужыкі, бачу таксама. І непадалёк — вадзіцель застаўся машыну правіць.

Так што гадзіны праз паўтары мы паехалі.

Зразумела, спазніліся — «толькі нас і чакалі», а таму — адразу ж за стол. Імянінніца пад першую чарку маю каронную салату падае, па крузе пускае.

У спадарожнікаў, бачу, ад здзіўлення аж мову адняло:

— Дык гэта... не торт?! — пытаюць, ачомаўшыся.

— Не...

— А ў нас жа, — кажуць, — каньяк з сабой быў! Нам жа ў лесе, у цішы, на траве, так выпіць хацелася... Закускі не мелі.

...А ўсё з-за чаго? З-за пыхі вялікай. Прасцей трэба быць. Гэта — выгадна.

І. СКУРАТОВІЧ,

г. Мінск

«Не жалею, не зову, не плачу...»

У жніўні 1980 года пасля вучобы ў педагагічным вучылішчы я прыехала на работу ў вёску, уладкавалася на кватэру, у маленькім пакойчыку размясціла свой няхітры скарб. Складаўся ён у асноўным з метадычных дапаможнікаў, кніг, з партрэта любімага паэта Сяргея Ясеніна. Я яго на столік паставіла.

Гаспадыня цётка Ядзя зайшла. Пытаецца:

— А хто ж гэта?

— Ды так... Адзін знаёмы.

— Нішто сабе, — ацаніла цётка. — Бялявы, бач, кучаравы. Дзеўка, што да цябе ў гэтым пакоі жыла, таксама за кучаравага выйшла.

Я ледзь смех стрымала. Сказала, што мне, маўляў, гэта не пагражае.

— А ты ведаеш, — сумна зазначыла цётка, — што табе пагражае, што не?..

На выхадныя я паехала дамоў, да бацькоў. Калі ж потым вярнулася, гаспадыня, паставіўшы на стол кубак малака, буркнула:

— Лепш на мясцовых хлопцаў глядзела б. Болей толку было б.

Аказалася, да гаспадыні сын прыязджаў. Ён і патлумачыў, хто на тым здымку.

Але ж цётку я, можна сказаць, паслухала: пазнаёмілася з сынам яе суседкі, праз паўгода згулялі вяселле... Трое дзяцей у нас.

А кучаравы той... Не-не ды ўспомніцца.

Алена П.

Глыбоцкі раён

За дурной галавой...

Неяк з вёскі Іскра да Бялынічаў я пад'язджаў на гарбатым «Запарожцы». Не блізкі шлях, а лета на дварэ, спякота. Ды такая, што, як зараз кажуць, а ж мазгі плавяцца. І ў сон хіліць. Але ж, думаю, калі я задрамлю, то і вадзіцеля, крый Бог, за мною пацягне. Таму мы абодва мужна трымаліся, ехалі, няспешную гамонку вялі. А ні пра што — пра надвор'е, пасевы, у якіх я нічога не цяміў , віды на ўраджай, народныя прыкметы...

Да Бялынічаў ужо вярсты са тры заставалася, — пра машыны гамонка зайшла, пра амфібіі, якія могуць хоць па дарозе ехаць, хоць па вадзе паплыць.

— А твой «Запарожац», — кажу вадзіцелю, — за іх не горш. Нашу Друць, нябось, адным махам перамахнуў бы.

— Што Друць, — горда ўсміхнуўся аўтаўладальнік. — Гэта машына тут любую з рэк пераплыве.

— Ну, — сарвалася ў мяне, — г. ж не тоне.

«Запарожац» затармазіў. І досыць рэзка. Вадзіцель адчыніў дзверцы, што побач са мной, сказаў:

— Не падабаецца мая машына?! То шыбуй... Пехам.

Прыйшлося выйсці. Пакуль трапаў да Бялынічаў, думаў, што хай дрэнна, але ехаць, усё ж лепш, чым добра ісці.

А ўсё — з-за дурнога языка.

Так што потым, калі шанцавала на чым пад'ехаць, нічога дрэннага ні пра машыну, ні пра вадзіцеля я ніколі не гаварыў. І вам не раю.

Н.І. ДЗІГАЛЁЎ,

г. Бабруйск

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.693. Індэкс 63850. Зак. № 2869. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12